№ 26 (624) 15 ліпеня 2009 www.nn.by

незалежная газета

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Заснаваная ў лістападзе 1906. Аднoўленая ў маі 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыднёва, у серады



**«Наконт Колі я пажартаваў»**

Старонка 5



**Таццяна Беланогая**

Старонка 12

## У НУМАРЫ

**Гайдукевіч: «У нас амаль няма партыйцаў, якія б не сядзелі»**

Арыштаваны намеснік старшыні ЛДП Уладзімір Карунас. **Старонка 2.**

**Вёска мяняе звычкі**

Ні кароваў, ні свіней, ні нават бульбы. Натуральная гаспадарка дажывае апошнія гады, адыходзіць традыцыйны лад жыцця. Піша Сямён Печанко. **Старонка 8.**

**З беларускай на расійскую і назад**

Алег Азароўскі самастойна стварыў прадукт, над якім сядзеў бы крукам даследчы інстытут. Кампутарная праграма «Белазар» дазваляе перакладаць з расійскай на беларускую. **Старонка 15.**

**Расія — гняздо тэрору**

Палітыка Расіі нічым не розніцца ад таго, што рабіў у свой час Садам Хусэйн. Піша Сяргей Богдан. **Старонка 6.**

**П’еса для сытых мінчукоў**

Камедыя Францыса Вэбэра «Вячэра з дурнем» — бяспроігрышная. Пра новую пастаноўку Купалаўскага тэатру піша Павал Касцюкевіч. **Старонка 7.**

# Не з тых, што поўзаюць

Ёсць паказанні, што былыя афганцы рыхтавалі партызанскі рух на чале з Аўтуховічам. **Старонка 3.**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

«Наша Ніва» з’яўляецца ў кіёсках у Мінску ў сераду ад абеду, у рэгіёнах — у чацвер. На газету можна і падпісацца — глядзі **старонку 2**.



**Гісторыя Беларусі**

Алег Дзярновіч распачынае публікацыю сваёй новай кнігі на старонках «НН».

**Старонка 11.**

## Кіроўца-вар’ят можа пазбегнуць крымінальнай адказнасці

Папярэдні дыягназ пастаўлены кіроўцу, які ў мінулую пятніцу на кальцавой сталіцы пратараніў 7 машын. У мужчыны здарылася шызаафектнае расстройства маніякальнага тыпу. Калі дыягназ пацвердзіцца, крымінальная справа ўзбуджацца не будзе.

Як такі чалавек мог атрымаць правы кіраваць машынай? Доктарка-псіхатэрапеўт Валянціна Пячэрская мяркуе, што кіроўца не змог бы атрымаць правы з такім дыягназам. Паводле яе словаў, шызафрэнія праяўляецца рана, гадоў да трыццаці, таму раптоўнае яе праяўленне ў 57-гадовага кіроўцы малаімавернае.

Як паведамілі ва ўправе ДАІ Маскоўскага раёну Мінску, даведка з псіханеўралагічнага дыспансэру пра тое, што гэты чалавек не стаіць на ўліку, ёсць. Яна выдаецца тэрмінам на 5 гадоў. Пакуль толькі не ўдалося высначыць, ад якой даты выдадзеная даведка.

Даказаць наяўнасць хваробы не так проста: для гэтага трэба назіраць за чалавекам некалькі месяцаў і праводзіць апытанне на працягу доўгага часу. Доктарка мяркуе, што кіроўца мог проста прыдумаць сімптомы хваробы, каб пазбегнуць адказнасці за свае дзеянні.

Здарылася аварыя 10 ліпеня. Пацярпелі тры чалавекі.

Адметна, што мужчына мае больш за 25 гадоў стажу кіроўцы. Пры затрыманні ён патлумачыў, што чуў галасы, якія загадвалі яму таранiць машыны.

**Вольга Жарнасек**



**Беларус, які арганізаваў уйгурскую партызанку**

Для Анатоля Тараса цяперашняе змаганне уйгураў за незалежнасць не стала навіной. У свой час, калі Тарас служыў у адной з частак савецкага ГВУ, ён дастаўляў уйгурам зброю і вучыў ёй карыстацца. **Старонка 9.**

## МАРШРУТЫ ПА БЕЛАРУСІ

**Глушчына. Але не глуш**

Як і ў Мінску. Толькі паветра чысцейшае. Вандруем разам з Сяргеем Харэўскім. **Старонка 13.**

# Арыштаваны намеснік Гайдукевіча

Арыштаваны намеснік старшыні Ліберальна-дэмакратычнай партыі, дэпутат Мінгарсавету Уладзімір Карунас. Яго абвінавачваюць у падбухторванні да давання хабару ў памеры 6 тысяч даляраў ЗША.

Старшыня ЛДП Сяргей Гайдукевіч кажа, што Карунаса ўжо неаднаразова выклікалі на гутаркі ў КДБ, але тады гэтаму не надавалі асаблівай увагі. «Пасля аднаго такога выкліку ён не вярнуўся. Напэўна, у яго была нейкая вельмі сур'ёзная інфармацыя, якую з яго выбівалі. Пра што дакладна, я не ведаю», — кажа С.Гайдукевіч.

**Гайдукевіч: «У нас амаль няма партыйцаў, якія б не сядзелі».**

«Мы не ведаем, што з ім цяпер. Адваката да яго не пускаюць. Ніякіх вестак таксама няма. Калі самі нешта даведаецеся, то паведамце», — просіць экс-кандыдат на пасаду прэзідэнта.

Пытаюся ў Сяргея Гайдукевіча, ці не паўплывае арышт на рэйтынг ягонай партыі і намеры іх лідэра ўдзельнічаць у наступных прэзідэнцкіх выбарах. «Ды Вы што?! У нас амаль няма партыйцаў, якія б не сядзелі. Нешта і СМІ маўчаць пра Карунаса, не паказваюць па тэлебачанні. Калі пачнуць паказваць, то мне гэта ўздыме рэйтынг разоў у 20!», — гаворыць С.Гайдукевіч.



Уладзімір Карунас нарадзіўся ў 1955 годзе. Мае вышэйшую ваенную адукацыю — ваенны інжынер па радыётэхніцы. Падчас мінулых прэзідэнцкіх кампаній узначальваў выбарчы штаб Сяргея Гайдукевіча.

**Зміцер Панкавец**

## СЦІСЛА

### Доўгачаканая спёка

Згодна з прагнозамі сіноптыкаў, 15—17 ліпеня чакаецца пераменная воблачнасць. Пераважна без ападкаў, толькі месцамі пройдуць кароткія дажджы. Воля будзе загараць і плаваць: паветра прагрэецца ўдзень да 24—29°С, а на Брэстчыне й Гомельшчыне — да плюс 30—32°С.

### У Макея — сын ад другога шлюбу

Жонка кіраўніка Адміністрацыі прэзідэнта Уладзіміра Макея, акторка Вера Палякова, нарадзіла сына. І ў Макея, і ў Паляковай гэта другі шлюб. Сын Макея ад першага шлюбу працуе дыпламатам у Аўстрыі.

**МБ**

### «Нацыянальнасць — беларус»: прэзентацыі новай кнігі Алега Латышонка

**Панядзелак, 20 ліпеня: Бярозаўка — 17.30, Слонім — 20.30.**
**Аўторак, 21 ліпеня: Ваўкавыск — 17.30, Масты — 19.30.**
Даведкі праз тэл.: (029) 550–79–69, 155–88–93.

### «ARCHE» ў Полацку

**25 ліпеня — прэзентацыя Полацкага нумару часопіса ў горадзе-герої выдання.** Удзел бяруць Алесь Аркуш, Уладзімер Арлоў, Міхась Баўтовіч і Валер Булгакаў. **Пачатак у 16.30.** Даведкі праз тэл.: (029) 550–79–69.

ЯК НЕ МАЕ БЫЦЬ

# Як у Шчорсах рамантуюць царкву XVIII стагоддзя

**Грузавік з вышкай заехаў проста ў памяшканне, паабдзіраўшы да цэглы тынкоўку на ўваходзе. Між іншым, гэта першы сур'ёзны рамонт за дваццаць гадоў ад моманту вяртання храму вернікам.**

Трапіўшы апошнімі днямі ў Шчорсы, што на Наваградчыне, у мясцовай царкве, збудаванай у 1770—1776 гадах на сродкі графа Яўхіма Храптовіча, можна было пабачыць наступную карціну: на прыступках ляжаць дошкі, у праходах тынкоўка паабдзіраная да цэглы, дасталося і самой цэгле. А ўсярэдзіне, зусім блізенька ад алтара, стаіць грузавік з вышкай пад самую столь. У люльцы чалавек — чысціць столь. Царкоўнае ўбранне прыкрытае цэлафанам. Адшукаць мясцовага бацюшку, айца Міхаіла Кушнерчука, аказалася няпроста, таму па тлумачэнні давялося звяртацца да матушкі. Тая апавяла, што па-іншаму пачысціць ды пабяліць столь проста не атрымлівалася.

Міністэрства культуры ўжо зрабіла заўвагу за пашкоджаны праход. Між іншым, гэта першы сур'ёзны рамонт за дваццаць гадоў ад моманту вяртання храму вернікам у 1988 годзе. З таго часу ў царкве праводзіліся лакальныя рамонтныя працы – фарбавалася падлога, бяліліся сцены, праводзілася ацяпленне.

Дзмітраўская царква ў Шчорсах была пабудаваная на месцы старой драўлянай царквы. Праект падрыхтавалі знакамітыя італьянскія архітэктары Джузэпэ Сака і Карла Спампані. Ад пачатку храм быў уніяцкім, пасля далучэння Беларусі да Расійскай імперыі стаў праваслаўным. У 50-я гады мінулага стагоддзя царкву ператварылі ў спортзалу, пасля там захоўвалася зерне, якое ў будынак, дарэчы, таксама завозілі на грузавіках.

У 2004 годзе Дзмітраўская царква трапіла ў поле ўвагі СМІ пасля таго, як у яе патрапіла шаравая маланка. Па словах відавочцаў, ад царквы агнявы шар адскочыў у бок сельсавету, і той загарэўся. У Шчорсах тады шмат у каго згарэлі тэлевізары, лядоўні і адзіны на той момант у мястэчку кампутар.

**Сямён Печанко, фота аўтара**




# Не ўсё ў жыцці ў апошні раз

**Падпісацца можна праз Рэдакцыю і праз «Белпошту». Мы рэкамендуем — праз Рэдакцыю**

Цана падпіскі праз Рэдакцыю на месяц складае **6000 рублёў**.

Наша сістэма дастаўкі газеты за 3 гады даказала сваю надзейнасць. Усе тыя, каго такі спосаб атрымання газеты задавальняе, хай застаюцца вернымі такой падпісцы.

Мы зможам дастаўляць Вам газету хутчэй або з той жа хуткасцю, што «Белпошта».

Падпісныя індэксы ў каталогу «Белпошты»: для людзей — **63125**, для прадпрыемстваў — **631252**. Падпісацца можна на кожнай пошце. Цана гэтай падпіскі — 8 520 руб. на месяц.

ПАВЕДАМЛЕННЕ

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828
МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Мінск, код 764
Рахунак атрымальніка 3012 206 280 014 | Асабовы рахунак
(прозвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газету "Наша Ніва" | | | | | |

Агулам
Касір

КВІТАНЦЫЯ

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828
МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Мінск, код 764
Рахунак атрымальніка 3012 206 280 014 | Асабовы рахунак
(прозвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газету "Наша Ніва" | | | | | |

Агулам
Касір М.П.

**Каб штотыдзень атрымліваць газету,** дасылайце адрасы і грошы па газету. Кошт на месяц — 6 тыс. рублёў.

1) Просім усіх ахвотных чытаць газету **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз:** тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32, (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@nn.by, паштовы адрас: 220050, г.Мінск, а/с 537.

2) **Просім у бланку банкаўскага паведамлення ці паштовага перказу дакладна і разборліва пазначаць адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езду.**


# Дзякуй за ахвяраванні

В.Л., Тамары Л., Таццяне В., Алегу Т., С.Ц., Георгію П., А.Дз., Валянціне Дз., В.Л., Генадзю Ш., Галіне Ж., Дзмітрыю Я., В.Б., Ніне Ш., Ігару Б., Аляксандру С., Івану С., Г.С., Р.П., П.Ч., Сямёну Л., Вользе Ш., З.А., А.Л., Л.Г., Валянціне Ш., Міхаілу М., І.Л., Уладзіміру А., Ігару Г., Валянціне Ц., Уладзіміру Г., Ганне Ф., В.Ж., М.С., Ніне К., Віктару М., М.Б., Уладзіміру К., Віталю Б., Ларысе Ц., Наталлі А., І.Ш., Алесю Дз., А.Д., К.М., Дзмітрыю Р., Але К., А.Б., Альберту С., Юрыю Я., М.Л., А.Т., А.С., С.П., Лідзіі І., В.Р., Кірылу М., Наталлі М., Аляксандру С., Івану К., Стэфану Н., А.К., Н.Б., В.Ч., Валянціне А., Міхаілу Ш., Г.К., І.Я., Юрыю М., Паўлу Д., І.К., Ігару Б., Фёдару К., В.Ч., Л.С., А.М., В.Г., Паўлу П., Міхалу А., Леаніду Л., Наталлі К., Аляксандру П., Алегу С., Э.Б., В.П., В.Г., Д.К., Ніне Н., Таццяне Б., Н.К., Г.Дз., І.З., Людміле І., Нэлі А., С.В., Валянціне Л., В.І., С.Ц., Д.Ш., З.А., П.Ж., У.Ш. з Мінску.

# На Аўтуховіча вешаюць замах на гродзенскага «губернатара»

**Крымінальную справу Мікалая Аўтуховіча і ягоных паплечнікаў збіраюцца перакваліфікаваць у тэрарызм. Нібыта яны рыхтавалі замах на старшыню Гродзенскага аблвыканкаму Уладзіміра Саўчанку і намесніка міністра па падатках і зборах Васіля Камянко.**

Гэта артыкул 359 Крымінальнага кодэксу «Замах на жыццё дзяржаўнага ці грамадскага дзеяча, здзейсненае ў сувязі з яго дзяржаўнай ці грамадскай дзейнасцю з мэтай дэстабілізацыі грамадскага парадку, ці ўздзеяння на прыняцце рашэнняў дзяржаўнымі органамі, ці перашкодзіць палітычнай ці іншай грамадскай дзейнасці, ці з помсты за такую дзейнасць». Санкцыі паводле артыкулу — ад дзесяці да дваццаці пяці гадоў пазбаўлення волі, ці пажыццёвае зняволенне, ці смяротнае пакаранне.

Праваабаронца Алег Воўчак кажа, што падобныя меркаванні выказваў яшчэ на трэці дзень арышту. «Нашыя прагнозы наконт таго, што справа з падпаламі дамоў падатковага інспектара Мандзіка і міліцыянта Кацубы аказалася толькі прыкрыццём, спраўджваюцца. Следчым было прасцей затрымаць Аўтуховіча менавіта па гэтых злачынствах, а ўжо потым праводзіць дзеянні аб гранатамёце і тэрарызме», — кажа А.Воўчак.

Справа ў тым, што яшчэ 31 кастрычніка 2005 году на тэрыторыі гродзенскай школы-ліцэю №1 быў знойдзены гранатамёт і выбуховае прыстасаванне, якое не спрацавала. Варта адзначыць, што адбывалася гэта напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў. Тагачасны старшыня КДБ Сцяпан Сухарэнка нават паабяцаў гучныя справы па тэрарызме, аднак абышоўся толькі вядомымі «пацукамі». Тады ж пачалі правяраць на датычнасць да падрыхтоўкі замаху многіх іншадумцаў з Гродзенскай вобласці, у тым ліку і Аўтуховіча.

«Гэта чарговыя фантазіі праваахоўнікаў, — кажа А.Воўчак. — На той момант Мікалай Аўтуховіч ужо два тыдні знаходзіўся за кратамі па сваёй першай крымінальнай справе і ніяк не мог быць да гэтага датычны. Справа ў тым, што Аўтуховіч тады абвясціў галадоўку са словамі, што ў яго смерці будзе вінаваты Уладзімір Саўчанка, які ініцыяваў гэты арышт».

Пра тое, што справу Аўтуховіча збіраюцца перакваліфікаваць у тэрарызм, стала вядома ад яшчэ аднаго арыштаванага «афганца» — Канстанціна Уланава, якому дазволілі патэлефанаваць жонцы. Мужчыну допытваюць менавіта па гэтай справе.

Яшчэ 8 лютага, у той самы дзень, калі арыштоўвалі Мікалая Аўтуховіча, Юрыя Лявонава, Уладзіміра Асіпенку, быў таксама затрыманы Аляксандр Ларын, які раней працаваў разам з астатнімі, але са скандалам сышоў з фірмы таксі. Праз тыдзень яго адпусцілі з ізалятару, але потым зноў затрымалі. Пасля другога арышту Ларын даў паказанні, якія і гавораць пра тое, што Аўтуховіч быў ініцыятарам замаху. Таксама ў паказаннях Ларына ёсць фраза пра тое, што былыя «афганцы» рыхтавалі партызанскі рух.

«Я не давяраю гэтым паказанням. Ведаеце, нядаўна я вывучаў матэрыялы справы свайго рэпрэсаванага за Сталіным дзеда. У тых паказаннях вельмі шмат ненатуральных, завучаных фразаў. Тое самае і цяпер з паказаннямі Ларына», — кажа Воўчак.

Алег Воўчак і Аляксандр Камароўскі ад імя Аб'яднання ветэранаў вайны ў Афганістане збіраюцца звярнуцца ў заходнія краіны, а таксама Расію з просьбай аб міжнароднай экспертызе па справе Аўтуховіча.

«Пакідаць так гэта нельга. Новымі абвінавачваннямі ўлады хочуць збіць моцнае інфармацыйнае поле па гэтай справе. Пераканаць еўрапейцаў, што гэта ніякі не палітвязень, а звычайны тэрарыст», — падсумоўвае А.Воўчак.

Цікава, што сам Васіль Камянко нічога не чуў пра замах, які на яго рыхтаваўся. Але ведае, што цяпер вядзецца следства па гэтай справе. Незразумела, навошта Аўтуховічу было рыхтаваць замах на Камянко, бо той адказваў у ведамстве зусім не за Гродзенскую, а за Магілёўскую вобласць.

Тым часам сам Мікалай Аўтуховіч працягвае галадоўку, якая доўжыцца ўжо больш за 90 дзён. «Ужо адчуваю сябе дрэнна, скардзіўся на тое, што ледзь да мяне выйшаў. Але ходзіць сам, ён не з тых людзей, якія поўзаюць. Вельмі схуднеў, змарнеў. Важыць каля 75 кілаграмаў, але галадоўку спыняць не збіраецца», — паведаміў адвакат Павел Сапелка.

**Зміцер Панкавец**

Каментар Віталя Тараса — **старонка 6**.

# «Наўрад ці праз 10 гадоў я буду прэзідэнтам»

10 ліпеня споўнілася 15 гадоў як на пасадзе кіраўніка Беларусі знаходзіцца Аляксандр Лукашэнка.

У нядаўнім інтэрв'ю аўстрыйскай газеце Die Presse Лукашэнка сказаў, што наўрад ці будзе прэзідэнтам краіны праз 10 гадоў. «Я думаю, што да гэтага часу вырастуць новыя людзі, якія возьмуць у рукі краіну і павядуць яе».

Што датычыць малодшага сына Лукашэнкі, то кіраўнік дзяржавы абверг размовы пра тое, што ён рыхтуе хлопчыка ў пераемнікі. «У нас гэта немагчыма. І калі я гаварыў пра свайго малога, то гэта быў звычайны жарт. Але журналісты чамусьці ўспрынялі гэта сур'ёзна», — сказаў беларускі лідэр.

Яшчэ меней часу на кіраванне Лукашэнку адводзіць галоўны рэдактар друкаванага органа Адміністрацыі прэзідэнта — «Советской Белоруссии» — Павел Якубовіч. У інтэрв'ю агенцтву БелаПАН ён сказаў: «Праз пяць-шэсць гадоў выйдуць на авансцэну гісторыі новыя палітыкі, якія павядуць справу далей».

**ЗП**

# Беларускія чыноўнікі будуць стажыравацца ў Польшчы

Пра гэта ў аўторак на сустрэчы з журналістамі заявіў пасол Польшчы Генрык Літвін. Паездкі будуць адбывацца ў рамках праграмы «Усходняе партнёрства».

На пытанне, ці сочыць польскае дыпламатычнае прадстаўніцтва за справай Мікалая Аўтуховіча, Генрык Літвін адказаў, што тут ягоная краіна дзейнічае як сябар Еўрасаюзу, які разглядае справу найперш з гуманітарных пазіцый.

«Лепш задавайце гэтыя пытанні паслу Швецыі, якая цяпер старшынюе ў ЕС», — зазначыў пасол.

**ЗП**




**Маладафронтаўка Людвіся Атакулава карыстаецца асаблівай увагай.**

# Звольнілі за здадзены пакой

Пажарніка Івана Пракапца звольнілі з працы за тое, што ён здаваў пакой маладафронтаўцы Людвісі Атакулавай. Іван працаваў у Мінскім гарадскім упраўленні Міністэрства па надзвычайных сітуацыях.

У пачатку чэрвеня Івана Пракапца выклікаў маёр, які сказаў, што ім цікавіўся КДБ. Маўляў, на кватэры, якую ён здае, утварыўся штаб-кватэру БНФ. Варта адзначыць, што кватэра здавалася не толькі маладафронтаўкам, але і людзям, абсалютна далёкім да палітыкі.

«Для мяне гэта было поўнае неразуменне, бо да апазіцыі я не маю ніякага дачынення, апроч таго, што асабіста ведаю Людвісю», — кажа І.Пракапец.

Праз нейкі час пажарніку прапанавалі падпісаць абходны ліст і паведамілі пра звальненне. На сваёй працы Пракапец прабыў два з паловай гады, і ніякіх праблемаў да гэтага не ўзнікала.

Апроч працы ў МНС хлопец таксама займаецца мініфутболам, ён гуляе ў камандзе «Барысаў-900» у чэмпіянаце краіны. Невялікія праблемы ўзніклі і тут. Праз звальненне яго не ўзялі на збор каманды.

Зрэшты, у міні-футболе Пракапец усё адно застаецца. А вось з асноўнай працай пакуль няяснасць — нікуды ўладкавацца ён пакуль так і не змог.

**ЗП**

## СЦІСЛА

### Пасол Францыі: У ЕС вялікія планы ў дачыненні да Беларусі

«Спадзяемся, што Беларусь зойме сваё заслужанае месца на еўрапейскім кантыненце, у еўрапейскай сям'і», — сказала Мірэй Мюсо. Яна падкрэсліла, што ЕС чакае ад Беларусі павагі да такіх асноўных дэмакратычных свабод як правы грамадзян на стварэнне аб'яднанняў і свабода прэсы.

### Арыштаваны высокі чыноўнік з Дзяржкантролю

У турму трапіў былы начальнік следчага ўпраўлення дэпартаменту фінансавых расследаванняў Камітэту дзяржаўнага кантролю Генадзь Гапоненка. Як паведамляе інтэрнэт-выданне «Ежедневник», яму інкрымінуецца тое, што ён на працягу пяці гадоў «даваў дах» аднаму сталічнаму бізнэсоўцу.

### «Белсату» зноў адмовілі ў акрэдытацыі

У МЗС патлумачылі гэта адсутнасцю аднаго дакументу — «Палажэння аб карэспандэнцкім пункце».

### Дубскага перавялі ў бабруйскае СІЗА

У следчым ізалятары юнак будзе знаходзіцца да перагляду крымінальнай справы вышэйшымі інстанцыямі.

**ЗП, БелаПАН**

# Колькі вінна Беларусь

**Прыцягненне грошай у эканоміку — станоўчы факт. Але хто будзе аддаваць пазычаныя мільярды? Ці зможа эканоміка Беларусі вытрымаць гіганцкую нагрузку, калі большую частку прыбытку ад экспарту давядзецца адразу ж аддаваць? Пра гэта карэспандэнт «НН» гутарыць з эканамістам Аляксандрам Чубрыкам.**

**Аляксандр Чубрык:** Меркаванні ў інтэрнэце наконт таго, што ў дзяржавы ні ў якім разе не хопіць грошай, каб разлічыцца з крэдытамі, неабгрунтаваныя. «Эксперты» проста пралічваюць, што будзе, калі нічога ў эканоміцы не зменіцца і застанецца тая ж сітуацыя. А яна не можа не змяняцца. Урэшце, раптам да 2012 г., калі трэба будзе разлічвацца, крызіс увогуле скончыцца! Сусветная эканоміка зробіць скачок уверх, і вярнуць грошы не будзе праблемай для ўраду.

**«Наша Ніва»: З якіх крыніцаў могуць з'явіцца грошы ў сённяшніх рэаліях?**

**АЧ:** Па-першае, грошы выдаюцца Беларусі не проста так, а для правядзення рэформаў. Асабліва Міжнародным валютным фондам — у яго вельмі жорсткія патрабаванні. Калі ўлады здолеюць перабудаваць эканоміку ў найбліжэйшы час, гэта дасць рост эканамічнага развіцця. Ад нас патрабуюць праводзіць прыватызацыю. За буйныя прадпрыемствы дзяржава атрымае досыць вялікія грошы. Вось яшчэ адна з асноўных крыніцаў.

Калі атрымаецца выраўняць гандлёвы баланс, прыбытак ад экспарту будзе ісці на пагашэнне доўгу. Урэшце, улада не будзе траціць абавязкова ўсе атрыманыя грошы. Штосьці застанецца ў золатавалютным фондзе.

Па-другое, трэба ўлічваць, што калі Міжнародны валютны фонд убачыць, што ўсе рэкамендацыі выконваюцца, адбываюцца рэформы, краіна патроху выбіраецца з крызісу, ён можа рэструктурызаваць пазыку — адцягнуць выплаты на пазнейшы тэрмін. І тады Беларусі хопіць часу, каб назбіраць грошай.

**«НН»: Калі ўсё ж разглядаць песімістычны варыянт, якая імавернасць таго, што Лукашэнка назбірае грошай па ўсім свеце, а пасля аб'явіць дэфолт і адмовіцца вяртаць крэдыты?**

**АЧ:** Гэта малаімаверна. Сітуацыя, калі арыштоўваюцца замежныя рахункі і выручка, робіць непапраўную шкоду іміджу краіны.

**Ягор Марціновіч**


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Аляксандр Чубрык**
эканаміст даследчага цэнтру Інстытуту прадпрымальніцтва і мэнэджмэнту.

**Крэдыты Беларусі за апошні час**

МВФ мае выдаць Беларусі $3,5 млрд. Атрымана $1,48 млрд, наперадзе яшчэ $2,04 млрд. Аддаваць пазыку трэба з 2012 г.

Расія дала крэдытаў на $3 млрд. Атрымана $1,5 млрд у 2007 г. і $1,5 млрд у 2008—2009 г. Першую пазыку трэба сплочваць з 2012 г., другую — з 2014 г.

Венесуэла дала $500 млн, аддаваць іх трэба з 2016 г.

Кітай — своп (пазычанне–абмен) $3 млрд. Вяртаць таксама трэба з 2012 г.

Італія дала крэдыт на $300 млн.

**Хто (пакуль) не даў грошай?**

У Расіі Беларусь прасіла $9 млрд у на будаўніцтва АЭС.

У ЗША — $5 млрд.

У Еўрасаюзу — сума невядомая, але просьба Беларусі ўжо адпраўлена

## Да канца году пазыка складзе 14—15% ад ВУП

Пазыка краіны падзяляецца на ўнутраную і замежную. Унутраная складаецца з фінансавых абавязанняў у мясцовай валюце. Напрыклад, гэта аблігацыі. А замежная фармуецца з крэдытаў, якія бяруць дзяржава, банкі, прадпрыемствы. Яна пагашаецца за кошт экспарту ці новых пазыкаў. Замежная пазыка Беларусі пачала рэзка расці ў 2007 г. і не думае спыняцца. Вядома ж, большую частку гэтых грошай павінная аддаць не дзяржава, а прадпрыемствы, але сярод кампаній-пазыкаатрымальніцаў шмат суб'ектаў з дзяржаўнай доляй у статутным фондзе. У выпадку чаго дзяржава змушаная будзе дапамагаць ім разлічвацца па крэдытах.

А вось дзяржаўную пазыку дакладна будзе аддаваць сама дзяржава. Яна таксама расце з 2007 году і таксама шалёнымі тэмпамі. За два з паловай гады яна павялічылася ў 6 разоў!

Калі кажуць пра небяспеку вялікага памеру пазыкі, звычайна вылічваюць яго суадносіны з памерам ВУП краіны. У нашай краіне пазыка складае няшмат, 10% вытворчасці, а да канца году можа павялічыцца да 14—15%. Міністр фінансаў **Андрэй Харкавец** упэўнены, што ўсё пад кантролем: «Мы знаходзімся ў зоне абсалютнай бяспекі».

Незалежныя эканамісты пагаджаюцца, што сітуацыя далёкая ад крытычнай, але іх напружвае занадта імклівы рост памераў дзяржаўнай пазыкі. Былога ж старшыню Нацыянальнага банка **Станіслава Багданкевіча** непакоіць не так памер крэдытаў, як тое, што гэтыя грошы выкарыстоўваюцца не для рэформаў. Калі б краіна мела станоўчае гандлёвае сальда, пытанняў да вялікіх крэдытаў увогуле б не ўзнікала.

**ЯМ**







## СЦІСЛА

### Афіцыйны курс еўра перакрочыў мяжу 4000 рублёў

14 ліпеня Нацыянальны банк усталяваў наступныя афіцыйны курс еўра — 4016,64 рубля, што стала гістарычным максімумам. Расійскі рубель каштуе 87,18, даляр ЗША — 2882 рублі. Павелічэнне каціровак даляра і еўра звязанае з аслабленнем расійскага рубля — трэцяй валюты, што ўваходзіць у кошык, і курс якой Нацбанк імкнецца трымаць стабільным. Такім чынам, з 1 студзеня (да моманту дэвальвацыі) курс еўра вырас на 30,53%, з 2 студзеня — на 8,47%, амерыканскага даляра, адпаведна, — на 31% і 8,75%.

### «БПС-банк» і «Белінвестбанк» — у чарзе на прыватызацыю

Патрэба атрымаць крэдыт МВФ змусіла ўлады пашырыць прыватызацыйныя спісы. У пераліку таго, што належыць прадаць у 2008—2010 г., трапілі дзяржаўныя «Белпрамбудбанк» і «Белінвестбанк». На «БПБ-банк» ужо паклаў вока расійскі «Сбербанк». Затое са спісу на прыватызацыю ў ліку 14 прадпрыемстваў выключаны «Гомсельмаш». Прыватызацыя наваполацкага РУП «Дружба» і РУП «Гомельтранснафта Дружба» перанесеная з 2009 на 2010 год.

### Дзяржпадтрымку атрымаюць 30 малаказаводаў

Выявіцца гэта ў субсідыяванні працэнтнай стаўкі па крэдытах. Умовай падтрымкі з'яўляецца выкананне прадпрыемствамі асноўных прагнозавых паказнікаў сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі па тэмпах росту вытворчасці і рэнтабельнасці прадукцыі.

### «Крыніца» пачала варыць цёмнае нефільтраванае піва

Раней на беларускім рынку прысутнічала толькі імпартнае піва такога тыпу. Для новага гатунку ААТ «Крыніца» падрыхтавала і новую форму бутэлькі. У склад піва «Культ пшанічнае цёмнае» ўваходзяць вада, ячменны светлы солад, пшаніца, пшанічны карамельны солад, хмель. Шчыльнасць экстрактыўнага сусла складае 12%.

### З'явіўся авіярэйс да Амстэрдаму

З 10 жніўня тройчы на тыдзень (панядзелак, серада, субота) у сталіцу Нідэрландаў з аэрапорту «Мінск-2» будуць лётаць самалёты «Белавія». Усе палёты будуць ажыццяўляцца на сучасных самалётах заходняй вытворчасці (CRJ-100/200 і Boeing-737/500) з абслугоўваннем у бізнэс- і эканомкласе. Працягласць палёту складзе 2 гадзіны 40 хвілін. Мінімальная цана квітка за пералёт у два бакі складае 280 еўра.

### На Гомельшчыне пачалося жніво

Першымі выехалі камбайны на палі Брагіншчыны. Ураджайнасць збожжавых і бабовых культур плануецца на ўзроўні мінулага году — 30,3 ц/га.

### На саміце G8 прэзентавалі «валюту будучыні»

Пра выкарыстанне гэтай валюты думаюць многія краіны свету. "Валюту будучыні" падаравалі на саміце ў Аквіле ўсім лідэрам «Вялікай васьмёркі». Пробную партыю унікальных манет адбілі ў Бельгіі. Яе сімвал і назва— «міжнародная валюта» — united future world currency — былі прынятыя ў выніку конкурсу, зладжанага ў тысячы школаў па ўсім свеце. Першачарговая мэта ўвядзення такой валюты — аб'яднаць фінансавыя сістэмы ЗША і ЕС. Але праект мае быць адкрытым і для іншых краін.

**Паводле БелаПАН**

# Лукашэнка: Наконт Колі-пераемніка я пажартаваў

Піша **Аляксандр Класкоўскі**.

Вы яшчэ не прасеклі, што Аляксандр Лукашэнка — чалавек з гумарам? То пажартуе, што «апошнія выбары мы сфальсіфікавалі», то наконт Колі-пераемніка. А пісакі не даганяюць, пачынаюць званіць на ўвесь свет.

У інтэрв’ю аўстрыйскай Die Presse ён так і патлумачыў, адказваючы на пытанне, ці сапраўды рыхтуецца перадаць уладу ў спадчыну малодшанькаму: «У нас гэта немагчыма. І калі я казаў пра свайго малога, то гэта быў звычайны жарт. Але журналісты чамусьці ўспрынялі гэта сур’ёзна».

«Чамусьці»! Канечне, калі б у нас працаваў механізм ратацыі элітаў, як у той самай Аўстрыі (дзе пра дынастычнае кіраванне нагадваюць хіба помнікі эпохі Габсбургаў), то было б дзіўна, што беларусы масава не ўязджаюць у гумар афіцыйнага лідэра. У краіне ж перапісанай канстытуцыі, «элегантных перамог» і рэферэндуму, які пераве́ў першага прэзідэнта на «безлімітны» тарыф што да тэрмінаў кіравання, не дзіва, што адпаведны гумар падаецца злавесным. Той выпадак, калі ў кожным жарце ёсць доля жарту.

І тым не менш! Яно б мо і хацелася пракруціць варыянт Аліева, але занадта шмат чыннікаў супраць. Кіроўная вярхоўка ўсё болей выразна асэнсоўвае: правадыр не вечны. Ды і сам ён задумваецца над чыннікамі з шэрагу «пугай абух не пераб’еш».

Сімптаматычнай выглядае свежая заява не апошняга ў Лукашэнкавым істэблішмэнце чалавека — Паўла Якубовіча: праз 5—6 гадоў на авансцэну беларускай палітыкі выйдуць новыя людзі. У інтэрв’ю Die Presse Лукашэнка фактычна кажа тое самае. На пытанне, ці будзе ён прэзідэнтам праз дзесяць гадоў, адказ быў такі: «Наўрад ці. Я думаю, да гэтага часу вырастуць новыя людзі, якія возьмуць у рукі краіну і павядуць яе».

Праўда, тут жа патлумачыў, што «ў нашай краіне хто будзе прэзідэнтам чарговым, будзе вызначаць толькі беларускі народ». Хто ведае, як выглядае ў нас выбар народа, не мае патрэбы ў расшыфроўцы.

Такім чынам, сімптомы сведчаць: Лукашэнка збіраецца на наступныя выбары, але потым сур’ёзна задумаецца пра пераемніка. І на выбары 2015 ці 2016 году можа быць высунуты новы кандыдат улады. Заўважце, варыянт яе перадачы старэйшаму сыну не адмаўляецца. Хаця тут сапраўды ўсё не так проста.

А пакуль палітычную сістэму будуць жорстка трымаць у старых рамках. Механізм элегантных перамог мусіць яшчэ раз спрацаваць у праверанам рэжыме. Ну, хіба што падгуляюць Еўропе касметычнымі зменамі ў Выбарчым кодэксе.

А вось з 2011-га можа пачацца суперцікавая гульня на ўнутрыпалітычным полі. Сістэму давядзецца пакрысе абнаўляць. Магчыма, у яе будуць асцярожна ўлучаць кіраваную апазіцыю. Зробяць выбары па партыйных спісах. Такая сістэма не замінае аўтарытарызму ні ў Расіі, ні ў Казахстане. Паўфабрыкат партыі ўлады пад брэндам «Белая Русь» ужо напагатове.

Палітычная перазагрузка — працэс для гэтай улады некамфортны, але з двух ліхаў выбіраюць меншае. Сталі працаваць моцныя вонкавыя чыннікі. Крызіс, тэхналагічнае адставанне і ціск Расіі змушаюць ладзіць эканамічныя рэформы, запускаць прыватызацыю, нармалізаваць дачыненні з Захадам. Усё гэта непазбежна цягне змены і ў палітычнай надбудове.

І спакваля працэс пайшоў. У згаданым інтэрв’ю Лукашэнка падсвядома нават выкарыстаў гэты выраз Гарбачова. Беларускі кіраўнік ухваліў патрабаванні колішняга «жулля з МВФ»: «Усе ўмовы разумныя. І чаму мы хутка дамовіліся? Бо ў нас гэты працэс ужо ідзе».



З 2011-га можа пачацца суперцікавая гульня на ўнутрыпалітычным полі. Сістэму давядзецца абнаўляць. Магчыма, у яе будуць асцярожна ўлучаць кіраваную апазіцыю.

Ён дадаў, што як прэзідэнт будзе «доўга памятаць дапамогу Міжнароднага валютнага фонду, Захаду нашай дзяржаве». Яшчэ больш: «І буду пераконваць свой народ, каб яны гэта ацанілі як след». Заявы, што пару гадоў таму выглядалі б фантастычна.

Дадамо, што народ і так прасякае фішку. Праеўрапейскі зрух у масавай свядомасці беларусаў на 15 працэнтных пунктаў за лічаныя месяцы выглядае ці не галоўнай сенсацыяй свежага даследавання Незалежнага інстытуту сацыяльна-эканамічных і палітычных даследаванняў (НІСЭПД). Калі летась у верасні за ўваходжанне ў ЕС былі гатовыя прагаласаваць толькі 26,7%, то сёлета ў чэрвені — ужо 41,4%. А з той Еўропай у нас яшчэ ж нічога як мае быць і не пачыналася! Вярхі адно знізілі градус прапагандысцкай нянавісці да Захаду. І тым не менш, тут таксама працэс пайшоў.

Паказальная і яшчэ адна заява аўстрыйскай газеце. Кажучы пра стасункі з Расіяй, Лукашэнка ўжыў рэфрэн «мы — адзін народ». Бадай, ён сапраўды так думае. І быў час, калі яму здавалася, што гэтая магічная формула адчыняе дарогу да маскоўскага трону. Беларусь ён лічыў пройдзеным для сябе этапам.

Але жыццё змусіла, насуперак тэзам пра «адзін народ», уперціся рогам і дэ-факта бараніць незалежную дзяржаву. І сёння, са словаў Лукашэнкі, уплыў Расіі на постсавецкай прасторы слабее. На пытанне, ці выклікае гэта шкадаванне ў Беларусі, ён адказаў: «Хай шкадуе Расія аб гэтым».

Беларусь не захацела быць «пройдзеным этапам» — і гэта ўжо нямала.

P.S. Аўстрыйская газета вынесла ў загаловак інтэрв’ю Лукашэнкавы словы «In Russland ist eine Diktatur möglich» («У Расіі дыктатура магчымая»). Цалкам пасаж такі: «Калі б у нас у Беларусі <...> была дыктатура, то Захад нас бы ўжо даўно раздушыў. Мы не Расія. Там дыктатура магчымая. Яны могуць дзякуючы ядзернай зброі ды энэрганосьбітам быць у баку ад крытыкі. Мы ж залежныя ад свету».

У стэнаграме на Лукашэнкавым сайце наконт Russland прыбрана. Вырашылі не дражніць мядзведзя. Але ж у Маскве, бадай, і па-нямецку чытаюць.

# Да З’езду беларусаў свету

Тэма з’езду — «Беларуская ідэнтычнасць, самаідэнтыфікацыя, нацыя»... Хто мы ёсць у гэтым складаным свеце, у часе сусветнай глабалізацыі, крызісу не толькі эканамічнага... Акрэсліць шлях у будучыню...

Падчас свайго выступу на V З’ездзе беларусаў свету, які пройдзе 18—19 ліпеня ў Мінску, мне б таксама хацелася акцэнтаваць увагу на тым, што ў наш час, калі ў штучным утварэнні «саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі» назіраецца глыбокі крызіс з пераходам у эканамічныя, інфармацыйныя войны, падаецца асабліва важным згуртавацца вакол лёсавызначальных ідэй незалежнасці і суверэнітэту нашай Айчыны.

Выходзячы з таго, што нам лёсам наканавана жыць з суседнімі краінамі, сярод якіх не апошняе месца займае Расія і замежнапалітычныя і эканамічныя сувязі з ёй, выклікае занепакоенасць далейшае развіццё падзей у «саюзе», калі Крэмль дыктуе Беларусі ўмовы з практыкі адышоўшай у нябыт ЦК КПСС.

З боку беларускага рэжыму спекуляцыя на «славянскім братэрстве», штогадовым вымагальніцтве і выпрошванні крэдытаў — шлях у нікуды.

Тое, што Беларусь прымаюць ва «Усходняе партнёрства» — пазітыўны крок, аднак спачатку мусіць адбыцца дэмакратызацыя нашай краіны ў адпаведнасці з сфармуляванымі Еўрасаюзам 12 умовамі.

Усе мы, удзельнікі З’езду, паслядоўна спавядаем ідэалы БНР, яе Устаўных граматаў, якімі 25 сакавіка 1918 г. была абвешчаная Беларуская Народная Рэспубліка як дзяржава новага тыпу. Толькі на падмурку БНР магла ў 1919 годзе паўстаць БССР (якой сёлета спаўняецца 90 гадоў).



Крэмль дыктуе Беларусі ўмовы з практыкі адышоўшай у нябыт ЦК КПСС.

Гістарычны разлом канца XX стагоддзя пры распадзе СССР паспрыяў новай якасці нашай дзяржаўнасці.

Гісторыя паказала, што задушыць беларускасць, асімiляваць канчаткова наш край — марныя стаpанні і надзеі русіфікатараў. Нашая пазіцыя — шукаць паразумення з расійскамоўнай, расійскаэтнічнай абшчынай, заахвочваць культурна-нацыянальную адметнасць украінцаў, рускіх, палякаў, габрэяў, татараў і ўсіх астатніх, ідучы па еўрапейскім вектары і абапіраючыся на нашыя спрадвечныя каштоўнасці.

Варта падтрымаць ініцыятыву Міністэрства культуры па ўвекавечванні памяці нашых слаўных, геpаічных продкаў. Віншаванні новаму кіраўніку міністэрства — Паўлу Латушку. Спадзяемся, што ў пашырэнні і развіцці беларускай культуры новы беларускамоўны міністр разумее важнасць, прыярытэт духоўнага над матэрыяльным. У звязку з гэтым захаваць гістарычную памяць, нашыя нацыянальныя каштоўнасці лічым галоўным у штодзённай працы міністра. Разам з тым, неабходна пазбавіцца прадметаў рытуальна-паганскага пакланення, што засталіся нам у спадчыну ад таталітарнага рэжыму савецкай эпохі.

Варта было б правесці дэкамунізацыю найменняў вуліцаў, плошчаў. Для шматлікіх помнікаў той эпохі знойдзецца месца, дзе гэтыя творы сацрэалізму будуць пачуваць сябе натуральна. Гэтае месца — «Лінія Сталіна», дзе разыгрываецца шоў для падлеткаў і недасведчаных людзей.

Мы заклікаем сілавыя структуры, міліцыю, абавязак якіх — *абараняць*, а не *нападаць*, спыніць фізічную расправу з мірнымі безабароннымі людзьмі, якія выказваюць свае палітычныя перакананні. Кожны выпадак супраць моладзі, таптанне нашых сімвалаў не праходзіць беспакарана. Глумленне з хрысціянскіх сімвалаў, што сталіся адзнакамі Дзяржаўнасці, ёсць вялікім грахом. І хто яго ведае, як гэта адгукнецца, хто тое робіць?

**Старшыня Згуртавання беларусаў свету «Бацькаўшчына» Алесь Марачкін**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

# Самазнішчэнне

Пра справу Аўтуховіча піша **Віталь Тарас**.

Днямі даволся паспрачацца з маладзейшым калегам. У прысутнасці іншых журналістаў я выказаў меркаванне, што незалежныя СМІ ў Беларусі недастаткова асвятляюць справу Мікалая Аўтуховіча і яго галадоўку.

У пераважнай большасці публікацыяў усё зводзіцца да канстатацыі факту: 50-ы дзень галадоўкі, 75-ы, 85-ы... Зразумець, у чым сутнасць крымінальнай справы, якая вымусіла прадпрымальніка з Ваўкавыску пайсці на скрайнія, адчайныя захады, вельмі цяжка.

Падпалы... гранатамёт... зацягванне следства, замена адных абвінавачванняў на іншыя, галадоўка пратэсту — вось, бадай, і ўсё, што застаецца ў памяці звычайнага чытача або гледача. І хоць каментароў на гэтую тэму, у тым ліку з боку юрыстаў і палітыкаў, хапае, цяжка пазбавіцца ўражання, што лёс чалавека, які павольна забівае сябе, жывучы на кропельніцы, адступае на задні план перад палітычнымі ці яшчэ нейкімі акалічнасцямі. Але ж чалавека трэба ратаваць...

У адказ калега абвінавації мяне ў тым, што я як журналіст «старой фармацыі» заклікаю прэсу выступіць у абарону апазіцыянера, у той час як гэтым павінныя займацца праваабаронча арганізацыі. А медыі, маўляў, павінныя займацца сваёй справай. На яго думку, чым часцей яны будуць пісаць і гаварыць пра Мікалая Аўтуховіча, тым хутчэй згасне цікавасць шырокай публікі да яго справы. Трэба найперш улічваць інтарэсы чытача і яго псіхалогію.

Магчыма, калега мае рацыю. Сапраўды, масавую аўдыторыю ў апошнія дні куды больш цікавілі абставіны смерці Майкла Джэксана і яго пахаванне ў Лос-Анджэлесе, чым галадоўка айчыннага прадпрымальніка ў турме. І я цалкам згодны з тым, што клікаць людзей на барыкады — не функцыя СМІ. Нават у палітыцы такія заклікі страцілі сэнс.

Але ж калі мы апрыёры ўпэўненыя, што беларускага чытача абсалютна не цікавіць лёс чалавека — прытым даволі вядомага, — дык гэта даволі сумная канстатацыя.

Сітуацыя нядобрая з усіх бакоў. Улады са свайго боку ўсімі праўдамі і няпраўдамі перакрываюць доступ прэсы да інфармацыі. Напрыклад, адвакату Аўтуховіча забаронена выказвацца па сутнасці яго справы, а следства не ідзе ні на якія кантакты з недзяржаўнай прэсай. Адзіная афіцыйная крыніца інфармацыі — турэмны лекар. У выніку ацэнка падзеяў гучыць толькі з вуснаў праваабаронцаў і палітычных дзеячаў. І хоць няма падставаў ім не давяраць, усё адно атрымліваецца аднабаковае асвятленне справы.

З іншага боку, чытач не хоча ведаць нічога пра галадоўкі і пра ўсё, што можа сапсаваць яму настрой альбо вывесці са стану ілюзорнай раўнавагі.

Ён пазбягае гэтай тэмы, як, напрыклад, і тэмы смяротнага пакарання. Як вядома, пасля прыняцця рэзалюцыі ПАРЕ, у якой уладам Беларусі настойліва рэкамендуецца (калі яна хоча атрымаць статус назіральніка) скасаваць пакаранне смерцю, адзін з асуджаных ужо быў расстраляны, а яшчэ аднаму нядаўна вынесены смяротны прысуд. І гэта не выклікала заўважнага рэзанансу ў прэсе, як і ў грамадстве ў цэлым.

Праўда, на канале АНТ у эфір нядаўна выйшла перадача, прысвечаная тэме смяротнага пакарання ў Беларусі. Падчас яе мы зноў змаглі пераканацца ў існаванні галоўнай праблемы — адсутнасці інфармацыі. Запрошаны на перадачу старшыня БХК Алег Гулак, напрыклад, адмовіўся даваць каментар наконт умоваў, у якіх утрымліваюць у месцах зняволення асуджаных на смерць. Адмовіўся з той простай прычыны, што афіцыйных звестак няма, а праваабаронцаў (ды нават і блізкіх сваякоў) да асуджаных не пускаюць. Прадстаўнікі ж пенітэнцыярнай сістэмы, натуральна, заяўлялі, што ўсё робіцца згодна з законам, а значыць — усё ў поўным парадку.

Якое дачыненне мае згаданая тэма да справы Аўтуховіча? А гэта проста другі бок аднаго медаля. Беларускае грамадства не гатовае задавацца складанымі маральнымі пытаннямі і нават не надта імі цікавіцца (а навошта, калі ў краіне ёсць галоўны чалавек, які за ўсё адказвае, — хай ён і вырашае).

Але гэта не значыць, што на тэмы смерці і маральнай адказнасці не трэба пісаць. Адзін артыкул ці нават цэлая серыя артыкулаў не здольныя змяніць грамадскую думку. Аднак варта нагадаць, што, напрыклад, у Францыі гільятына была прыведзеная ў дзеянне апошні раз не так даўно — у 1977 годзе (у той час яна перасоўвалася па розных гарадах гэтай краіны), пры жыцці цяперашняга дарослага пакалення. Смяротнае пакаранне ў Францыі было скасаванае нягледзячы на тое, што грамадская думка цалкам яго падтрымлівала. Сёння ў ЕС за вяртанне пакарання смерцю выступаюць толькі маргінальныя палітыкі.

Было б недаравальнай памылкай лічыць, што чыя б то ні было смерць, нават прынесеная ў ахвяру нейкім ідэалам і прынцыпам, можа палепшыць сітуацыю ў якой бы то ні было галіне жыцця. Самазнішчэнне чалавека проста легла б на грамадства і на нас усіх яшчэ адной чорнай плямай.

**Маці Аўтуховіча: «Ён за праўду трымаецца, таму і жывы»**

Лілія Аўтуховіч, маці вязня: Ён, можна сказаць, яшчэ нічога ў жыцці не бачыў. Навучанне, праца, войска... Цяпер вось турма. Тыя, хто яго трымае ў камеры, пасылалі сваіх дзяцей у Афганістан? Ці самі там былі? А цяпер вось яго ў турму, у голад. За што яны яго душаць? Гэта не людзі, так нават з быдлам не робяць. З Афганістану вярнуўся жывым, а тут быццам у палон трапіў да нелюдзяў. Ён што — вораг народа? Дык калі вораг — скажыце, у чым ён вораг? Ды сёння любога следчага пратрымай у голадзе хаця б тыдзень, дык ён прызнаецца, што вораг. А ён тры месяцы за праўду трымаецца, таму і жывы.

# Расія — гняздо тэрору

Палітыка Расіі нічым не розніцца ад таго, што рабіў у свой час Садам Хусэйн. Піша **Сяргей Богдан**.

Жахлівае забойства ў Дрэздэне выклікала абурэнне мільёнаў, аднак стала адначасна прыкладам скажэння рэчаіснасці.

Нібыта ўсё і ясна — вар'ят-ксенафоб проста ў залі суду зарэзаў іншаземку, якая паскардзілася на яго за лаянку. Вось ужо СМІ ствараюць карцінку, з аднаго боку, рэцыдыву нямецкага нацызму, а з другога — пакутніцтва за веру. Ідуць дэманстрацыі, ад Каіру да Тэгерану стаіць лямант пра «нямецкіх фашыстаў».

Але ёсць адна дэталь.

Забойца — 28-гадовы Алекс — дарма што нямецкі грамадзянін, нарадзіўся і вырас у Расіі ды прыехаў з Уралу толькі ў 2003 годзе.

У Нямеччыне ўніверсітэтаў, мякка кажучы, не скончаў ды не знайшоў працы меў не заўсёды. То бок сумнеўна, што ён меў магчымасць засвоіць ідэі мясцовых нямецкіх нацыстаў, нават з прычыны моўнага бар'еру. Затое надта імаверна, што свае ідэі ён прывёз са сваёй першай радзімы.

На гэтую дэталь «забываюцца» на Захадзе, там не прынята дражніць «загадкавую расійскую душу» лішні раз, каб не застацца без газу.

Дрэздэнскае забойства стала напамінам, якую небяспеку для свету ўяўляюць краіны, у якіх свабодна прапагандуюцца забойчыя ідэі.

Зазвычай прыкладамі такіх краін лічыліся Афганістан, Пакістан ды Самалі. Але Расія нічым ад іх у гэтым плане не розніцца. Усе памятаюць пра палоній для Літвіненкі і пра тэракт супраць Яндарбіева ў Катары.

Свет рабіў выгляд, што не чуе ксенафобскіх выказванняў Пуціна.

Злачынствы расійскіх сілавых органаў на Каўказе застаюцца беспакаранымі, і нават выбухі дамоў у Цэнтральнай Расіі ў 1999 годзе ціха пахаваныя ў архівах.

Рэгулярныя паведамленні пра забойствы на глебе расавай і нацыянальнай варожасці асобаў неславянскага выгляду ў Расіі даўно сталі дзяжурнай навіной. РНЕ і падобныя арганізацыі экспартуюць свае ідэі ў Латвію і нават Ізраіль.

Расія ператваралася ў крыніцу страху, якая і цэнтралізавана, і стыхійна сее яго не толькі на мікра-, але і на макраўзроўні, шантажуючы суседнія краіны. Што ж яшчэ мусіць зрабіць Крэмль, каб міжнародная супольнасць убачыла, што гэтая краіна ператваралася ў небяспеку для свету? Такая палітыка, па сутнасці, нічым не адрозніваецца ад таго, што рабіў Садам Хусэйн у свой час. На жаль, сёння вобраз нашага ўсходняга суседа — гэта «пуцінскія сокалы» ў грузінскім небе і дрэздэнскі вылодак з акрываўленым нажом у руцэ.



Для Беларусі сітуацыя ў Расіі — жыццёва важнае пытанне нацыянальнай бяспекі. З цэлага шэрагу прычынаў мы больш за іншых суседзяў Расіі ўразлівыя перад ёй. Тым больш важна ўсвядоміць пагрозу ідэяў расійскага расізму і фашызму, якія няспыннай плынню ідуць да нас праз адчыненую мяжу і расійскія СМІ.

ЦЫТАТЫ

## Якубовіч: Лукашэнка будзе кіраваць яшчэ 5—6 гадоў

Галоўны рэдактар газеты «Советская Белоруссия» Павел Якубовіч параўноўвае прэзідэнцтва Аляксандра Лукашэнкі з княжаваннем Івана Каліты: «Гэты князь за кошт самых разнастайных прыёмаў, якія не ўсім падабаюцца, змог адтэрмінаваць вайну з татарамі на некалькі пакаленняў».

«Праз пяць-шэсць гадоў выйдуць на авансцэну гісторыі новыя палітыкі, якія павядуць справу далей», — мяркуе лукашэнкаўскі ідэолаг.

**Паводле БелаПАН**

# П’еса для сытых мінчукоў

Камедыя Франсіса Вебера «Вячэра з дурнем» — бяспройгрышная. Пра новую пастаноўку Купалаўскага тэатру піша **Павал Касцюкевіч**.



### Даеш Парыж!

Часам краіне, у якой не дужа добра ідуць справы, трэба вайна. Няхай маленькая, але гарантавана пераможная. Пасля леташняга гармідару з адкрытым лістом акtoраў пра незайздросны стан рэчаў у тэатры «Купалаўскаму каралеўству» і яго новаму мастацкаму кіраўніку Мікалаю Пінігіну патрабавалася менавіта такая маленькая перамога. Можа, таму, замест таго каб замахнуцца на Вільяма нашага Шэкспіра, была выбраная бяспройгрышная камедыя Франсіса Вэбэра «Вячэра з дурнем».

...Паспяховы бізнэсовец, выдавец П’ер Брашан мае інтэлектуальную забаўку: штотыдзень запрашае на вячэру якогасьці ёлупа, каб у коле сяброў пацешыцца з яго недарэчных прамоваў. Але здараецца неспадзяванка: ад мсье Брашана ўцякае жонка, і ўзорны паспяхоўца вымушаны скарыстацца навыкамі такога ж узорнага, але дурня, Франсуа Піньёна, які сваімі нязграбнымі паводзінамі можа сапсаваць любую сітуацыю і гамоніць выключна пра свае зробленыя з запалак мадэлі...

Вайна «Купалаўская» выйграная. Зарукай таму былі і абкатанасць п’есы (колькі гадоў таму пінігінскі «Мікола-тэатр» ставіў яе на сцэне Клубу імя Дзяржынскага па-расійску), і дасціпныя дэкарацыі з актыўным выкарыстаннем відэашэрагу, і акторскі склад. Бурлескнае абое-рабое — Сяргей Журавель (мсье Брашан) і Віктар Манаеў (мсье Піньён) — спрактыкавана варажыла на сцэне, і калі і было на што наракаць, дык толькі на тое, што для поўнага АРТыстычнага трыюмвірату не ставала заслужанага чорта Беларусі Ігара Забары. У параўнанні з «дзяржынскай» купалаўская версія «Вячэры з дурнем» нават зазнала касметычны рамонт: лёгкае перакручванне некаторых фразаў з мэтаю наблізіць іх да беларускай класікі: «Няма таго, што раньш было», — выгукае сябар мсье Брашана, згадкі пра крызіс і г.д.

### Людзі і прыдуркі

Заўзятыя тэатралы кажуць, што на расійскай версіі яны так не цешыліся. Але, вядома, рэч не ў мове — змяніўся глядач. Калі колісь «Вячэру» яшчэ падавалі як «Ужин», тое была камерная камедыя сітуацыяў пра далёкае французскае жыццё. На Купалаўскай сцэне вымаляваліся раней нераскрытыя тэмы, і п’еса атрымала жаданую аб’ёмнасць.

За гэтыя гады мы яшчэ больш абраслі ўсімі гэтымі еўрапейскімі штучкамі: ад поўнай залежнасці ад электронных цацак да прыватнай шызы з калекцыянаваннем усяго-ўсялякага. Колькасць прусакоў у беларускай галаве за апошнія гады павялічылася і стала прыблізна роўнай сярэдняму еўрапейскаму стандарту. Цяпер прыватнае дзівацтва — неад’емная частка жыцця. Адзін, як мсье Піньён, апантаны макетамі з запалак, другі — яго сябар, падатковы інспектар — зацыклены на працы. Вэбэраўскія героі як бы нагадваюць, што ўслед за французамі прыйшла і нашая чарга навучыцца трываць побач з сабою дзівацтвы іншых: «Падумайце сем разоў перад тым, як назваць каго-небудзь прыдуркам», — кажа пад канец сімпатычны ёлуп Піньён. Акрамя таго, цяпер сюжэт — не якаясьці экзатычная (о-ля-ля!), незразумелая для беларускага гледача гісторыя пра візіт нейкай там падатковай інспекцыі. Гэтым разам уся сітуацыя жыва нагадвала АБЭЗаўскія наведванні прыватнага прадпрымальніка.

«Вячэра з дурнем» з п’есы пра парыжанаў, якія ўжо гадоў пяцьдзесят як не турбуюцца пра свой страўнік, пакрысе ператвараецца ў п’есу пра таксама ўжо сытых мінчукоў. Прыспела і нашая чарга адказваць на пытанне: «Чым мы зоймемся, калі наямося?» Новая пастаноўка «Купалаўскага» — нагода нязлосна, але дасціпна пасмяяцца з сябе сучасных і з таго дурня, якім мы часта выбіраем быць.

# Факты беларускай рэчаіснасці праглядаюцца

У Барысаве прайшла прэзентацыя тэлесерыялу пра карупцыю і каханне.

Першы нямінскі серыял «Школа» здымаюць у барысаўскім філіяле прыватнай тэлекампаніі «Скіф». Як кажа прадусарка Наталля Голава, з шаснаццаці запланаваных серыяў першага сезону ўжо зробленыя чатыры. Прэзентацыя серыялу прайшла 12 ліпеня ў барысаўскім Палацы культуры.

Паводле словаў удзельнікаў праекту, яго мэтай акрамя ўласна стварэння вартага серыялу было жаданне паказаць, што ў правінцыі таксама ёсць творчы патэнцыял, у які варта інвеставаць.

«Мы не ў Галівудзе, не на НТВ, і нават не на «Беларусьфільме», — кажа Сяргей Кузёменскі, кіраўнік барысаўскага філіялу тэлекампаніі «Скіф». — Практычна ўся група сумяшчае асноўную працу і працу ў праекце. Хоць наш маркетынгавы план улічвае атрыманне прыбытку, праект усё ж некамерцыйны: мы пакуль што вучымся здымаць кіно».

У серыяле з запрошаных зорак — заслужаны артыст Беларусі Сяргей Журавель (здымаецца ў ролі начальніка міліцыі). Песню на застаўку напісаў гомельскі бард Саша Моцарт, а музыку — барысаўскі ды-джэй MaxiMist.

Сюжэт «Школы»: разбэшчаныя карупцыяй мэр і свавольны начальнік гарадской міліцыі хочуць адабраць у дзяцей Дом дзіцячай творчасці, каб пабудаваць там турму. Ім процістаяць старшакласнікі на чале з дачкой мэра. Побач з асноўным сюжэтам, перакрыжоўваючыся, лятуць рамантычныя лініі: героі закохваюцца, сыходзяцца, разыходзяцца... Дзея шматсерыйнай меладрамы адбываецца ў вымысленым постсавецкім горадку Запольску, што мае свой лад, стыль жыцця і няпісаныя законы. «Мы хацелі зрабіць прыдуманы, даволі нейтральны горад, для міліцыянераў пашылі адметную форму, — кажа Наталля Голава, — але некаторыя факты беларускай рэчаіснасці ў серыяле ўсё ж праглядаюцца: барысаўскія краявіды і акторы, што размаўляюць з беларускім акцэнтам».

**ЛК**



Першыя часткі паказваюць ужо ў Оршы, Барысаве, Віцебску, Полацку і Бабруйску на тэлеканале «Скіф», а таксама ў Мінску на 8-м канале.




# Новы «Дзеяслоў»

Больш за пяць гадоў «Дзеяслоў» мае гонар друкаваць літаратурную спадчыну Васіля Быкава. Гэтым нумарам прыспела чарга першага беларускамоўнага апавядання пісьменніка «Прыклад далёкага сябра». Яно было зарэгістраванае ў архіве рэдакцыі «Гродненскай праўды» ў 1949 годзе (дарэчы, зусім першым было апавяданнне «В тот день», напісанае па-расійску).

Адзін са старэйшых літаратараў Віцебшчыны Давід Сімановіч дзеліцца занатоўкай прыватных гутарак з Васілём Быкавым, а крытык Ванкарэм Нікіфаровіч апавядае пра сваё знаёмства з вялікім гарадзенцам.

З нябыкаўскага: гэтым нумарам чытач мае магчымасць дакрануцца да літаратурнага твору, што як ніякі іншы паўплываў на нацыянальную тоеснасць фінаў, — да эпасу «Калевала», перакладзенага Якубам Лапаткам. А таксама пазнаёміцца з паэзіяй як блізкіх, так і далёкіх суседзяў — літоўцаў. З айчыннага: вершы Барадуліна і Хадановіча, апавяданні Мудрова і Дубаўца.

**Лявон К.**

## НОВЫЯ КНІГІ, ДАСЛАНЫЯ Ў РЭДАКЦЫЮ

**Крысціна Гамулка. Паміж Польшчай і Расіяй. Беларусь у канцэпцыях польскіх палітычных фарміраванняў (1918—1922) / К.Гамулка; пераклад з польскай мовы. — Вільня: 2006 — 256 с., 800 ас.**

Часопіс «Палітычная сфера» выдаў па-беларуску кніжку польскай даследчыцы Крысціны Гамулкі «Паміж Польшчай і Расіяй. Беларусь у канцэпцыях польскіх палітычных фарміраванняў 1918—1922». Аўтар разглядае польскія праекты палітычнага ўпарадкавання беларускіх земляў ды спробы іх рэалізацыі ў супрацьстаянні з іншымі бакамі. Кніжка не замыкаецца на вузкіх пытаннях, а паказвае вагу Беларусі і беларускага руху ў міжнароднай палітыцы таго часу.

Вырашальныя 1918—1922 гады перабудавалі ўсю Еўропу ад Хельсінкаў да Стамбулу. Беларусы, хоць і не дамагліся нацыянальнага адзінства і незалежнасці, але і не былі пасіўнымі, змагаючыся за сваю краіну на ўсіх баках у той татальнай калатнечы. Польшча як адзін з асноўных гульцоў вяла зацятую барацьбу з савецкай Масквой і Літвой за беларускія абшары, будуючы свае палітычныя праекты для Беларусі ды спрабуючы выкарыстаць беларускі рух.

Захапляльную версію гісторыі вялікай «бітвы за Беларусь» апавядае гэтая першая публікацыя з серыі «Гісторыя палітычных ідэяў», запачаткаванай часопісам.

**Сяргей Богдан**



PHOTO.BYMEDIA.NET

# Вёска мяняе звычкі

**Ні кароваў, ні свіней, ні нават бульбы. Натуральная гаспадарка дажывае апошнія гады, адыходзіць традыцыйны лад жыцця. Піша Сямён Печанко.**

Колькі гадоў таму малако ў вясковай краме ўспрымалася як выклік існаму ладу жыцця. Сёння ж тут можна набыць не толькі малако, але і смятану, і тварог, і нават ёгурты з глазураванымі сыркамі. Вяскоўцы тым часам пазбаўляюцца сваіх «рагуль».

Пяць гадоў таму, прыйшоўшы з войска, я пабачыў у нашай вясковай краме малако ў цэлафанавых пакунках. Выглядала гэта дзіўнавата, калі ўлічыць, што карову трымаў ці не кожны трэці, а нехта меў і не па адной. Людзі тады паставіліся да гэтага па-рознаму, але большасць не разумела, навошта гэта трэба. Цяпер пастэрызаваным малаком у самай рознай тары ў вёсцы нікога не ўразіш. Ці не штодня завозяць марожанае, а раней жа гэта было як свята, чаргу па яго адстойвалі. Стала жывучы ў горадзе, у часе нячастых наездаў на малую радзіму гэтаму амаль не надаеш увагі — што ж тут такога, што ў краме прадаецца малако ці тыя ж ёгурты. І ўжо потым з размовы з блізкімі даведваешся, што кароваў у вёсцы з кожным годам застаецца ўсё менш. «Раней адна толькі вуліца трымала каля трыццаці кароваў, цяпер тры суседнія вёскі разам узятыя маюць гэтулькі ж», — кажуць землякі.

Пакуль былі моцныя нашыя старыя ды бацькі, кароваў трымалі не задумваючыся. Дый як жа інакш — свае малако, масла, тварог. Акрамя таго, малако здавалі, атрымліваючы за гэта хай невялікую, але хоць нейкую капейчыну. Не зважалі на цяжкасці, а справа гэтая і сапраўды нялёгкая — чаго варта аднаго сена нарыхтаваць, а штодзённы догляд, а радоўка...

### Свіная валюта

«Вялікую гаспадарку з каровай, свіннямі, а то і з бычком на продаж сёння трымаюць тыя, каму за трыццаць, хто ўжо пасталеў ці ў каго бацькі яшчэ ў сіле. Зусім маладыя сем'і, асабліва каторыя па аграгарадках пасяліліся, добра калі курэй завядуць», — кажа прадпрымальнік Мікола з Карэліччыны. Ён займаецца перапродажам мяса — купляе ў вяскоўцаў свіней ды возіць у сталіцу на адзін з рынкаў. Яго бізнэс змены ў вясковым жыцці не кранулі, і свой прыбытак ён будзе гарантавана мець, прынамсі, пакуль заробкі ў большасці вяскоўцаў будуць невысокімі. «Свіней часцей гадуюць на продаж, бо заробкі малыя, а дзяцей у школу апранаць трэба за нешта, ды ці мала на што грошы могуць спатрэбіцца», — тлумачыць Мікола.

Справа гэтая выгадная далёка не кожнаму: не маючы доступу да таннейшых кармоў, свінагадоўляй лепей не займацца, бо мяса тое будзе «залатым». Таму бізнэс прадпрымальніка трымаецца ў асноўным на тых, хто працуе ў СВК. Старыя людзі, па яго словах, свіней амаль не гадуюць — здае пазіцыі старое пакаленне.

### Старыя не могуць, маладыя не хочуць

«Гадоў дзесяць таму ў нашай вёсцы на паўтысячы двароў было сто кароваў, сёння засталося каля трыццаці», — апавядае Зоя Пятроўна, жыхарка адной з вёсак на Драгічыншчыне. Моладзь з'язджае ў горад — хто ў вобласць, хто ў райцэнтр. Застаюцца толькі тыя, хто не здолеў паступіць на вучобу ці не ўтрымаўся ў горадзе. Большасць з гэтых маладых людзей — і тыя, што аселі ў горадзе, і тыя, хто застаўся, — не трымаюцца старых звычак, бо «навошта, калі ўсё ў краме купіць можна», да ўсяго, многія любяць выпіць. Калі ж хто і мае карову, то малака таго амаль не бачыць — які літр-два пакідаюць дзецям, астатняе — на продаж. Старыя ж проста ўжо не маюць больш сілаў ні карову трымаць, ні нават свінчо якое. Часта гаспадарка ў пенсіянераў — невялікі агарод, кот, сабака ды колькі курэй з пеўнем. А малако і сапраўды ў краме набыць можна. Свіней людзі трымаюць, але ізноў жа тыя, хто працуе пры танным корме. Эканамічная мэтазгоднасць пакрысе перамагае натуральную гаспадарку.

**Цэны на малако ў параўнанні**

Закупная цана ў 2008 годзе складала 665 рублёў за літр малака I гатунку.

У 2009 годзе закупная цана складае 600 рублёў.

### «Такое ўражанне, што людзі проста лянуюцца»

Ганна, чые бацькі на Капыльшчыне маюць каля гектару зямлі, лічыць, што ў людзей змянілася стаўленне да працы на зямлі. «Такое ўражанне, што людзі проста лянуюцца», — кажа яна. У іх вёсцы статак таксама імкліва скарачаецца: «Пяцьшэсць гадоў таму на нашай вуліцы трымалі каля сямі дзесяткаў галоваў, сёлета засталося каля трыццаці кароваў». Раней была праблема нарыхтаваць корму, асабліва з сенам цяжка было, але людзі ўсё адно трымалі быдла. Летам на кароўку працавала ўся сям'я — з вучобы прыязджалі дзеці. Потым увесь год яны вазілі з сабой у горад малако, тварог і сыр са смятанай. Дзеля гэтага, а таксама для здачы малака, і трымалі «зорак». І цяпер дзеці не перасталі вучыцца ў горадзе, і заробкі ў большасці не выраслі, але вось кароваў застаецца ўсё менш. А ахвотных іх трымаць, хоць бы і таму, што з кормам стала працей, не большае. У капыльскіх вёсках год ад году большае прыбышоў, якія прывозяць з сабой свае завядзёнкі. Вяртаюцца з прамысловых гарадоў на пенсію землякі, якія спачатку з энтузіязмам бяруцца гаспадарыць, але імпэт хутка знікае, і набытыя ў горадзе звычкі бяруць сваё.

Старое пакаленне, як і паўсюль, адыходзіць, маладых жа не прывабіш сумнеўным заробкам ад малака (літр прыносіць каля 600 рублёў), якое насамрэч мае немалую цану. Хто мае здароўе ды ахвочых да працы дзяцей, гадуе свіней ды бычкоў на здачу, бо на вясковы заробак не пражывеш. Моцныя гаспадары, а такіх усё меней, урабляюць зямлю з дапамогай тэхнікі.

### Расчараваныя ў бульбе

Па вёсках усё яшчэ ездзяць госці з Усходу, якія з восені да вясны купляюць у людзей бульбу. Але ахвочых зарабляць на «другім хлебе» робіцца ўсё меней — усё тая ж эканамічная мэтазгоднасць. Закупная цана гадамі не змяняецца, а працы не менш, чым з каровай. Трэба захаваць да вясны дастаткова насенкі, пасадзіць, абрабіць, выбраць і, нарэшце, бульба павінная спадабацца перакупніку — каб і вялікая была, і не пархатая. А калі палічыць, у якую капейчыну вылеціць той ураджай (бо калгасу за ўсё трэба заплаціць — ад пасадкі да хімічнай апрацоўкі), то робіцца зразумела, што ў найлепшым выпадку такая праца цягне на кароткатэрміновае ўкладанне грошай. Не ў кожнага на гэта ёсць час і здароўе. Бульбы ж можна купіць у больш моцнага суседа ці ў тым жа СВК. Большасць цяпер гадуе бульбу толькі сабе. Зарабляюць з зямлі больш моцныя і мэтаскіраваныя. Гэтыя гаспадары, магчыма, і складуць некалі тую аптымальнаю па колькасці праслойку вольных хлебаробаў, здольных накарміць сябе ды іншых.

Вёска няўхільна змяняецца — старое пакаленне адыходзіць, маладыя жадаюць жыць па новых правілах. Цяжка прымусіць сябе ўставаць а пятай раніцы дзеля кубка малака, калі тое малако прадаюць у краме.

Колькасць прыватнага статку ў межах краіны скарачаецца гіганцкімі тэмпамі — на 50 тысяч галоваў за год. Такія лічбы агучыў год таму былы ўжо міністр сельскай гаспадаркі Леанід Русак, які развітаўся з пасадай разгромным артыкулам у галоўнай аграрнай газеце. У ім чыноўнік казаў пра непазбежнасць ды натуральнасць такіх працэсаў: нам і не трэба столькі «рагуляў», а вось дагледзяць іх мусім паводле сучасных методык. І тут свае слова могуць сказаць у тым ліку і фермеры, якім усяго толькі не трэба перашкаджаць працаваць. Натуральная гаспадарка сваё аджыла, і мы ў гэтым не арыгінальныя.

**Сямён Печанко**

**Колькасць асабістых прысядзібных гаспадарак**




**Пагалоўе кароў у прыватных гаспадарках**



# Беларус, які арганізаваў уйгурскую партызанку

**Для Анатоля Тараса цяперашняе змаганне уйгураў за незалежнасць не стала навіной. У свой час, калі Тарас служыў у адной з частак савецкага ГРУ, ён дастаўляў уйгурам зброю і вучыў ёй карыстацца.**

**«НН»: Як Вы апынуліся ў Сіньцзян-Уйгурскай аўтаномнай акрузе?**

**Анатоль Тарас:** Я быў там у пачатку 70-х. Савецкая вайсковая выведка тады намагалася стварыць у КНР сваю нелегальную сетку з кваліфікаваных агентаў і распрацаваць планы дзеянняў гэтай сеткі ў «дзень Х». У наступныя часы уйгуры на гэтай аснове стварылі шэраг так званых «рэвалюцыйных арганізацый» (26 ці нават 27), якія разгарнулі ўзброены супраціў.

Сіньцзян [каланіяльная назва, «новая мяжа» па-кітайску], або Усходні Туркестан [гэтай назве аддаюць перавагу самі уйгуры] — гэта вялізная краіна, у асноўным стэп, горы і саланчаковыя паўпустыні. Кітайцы, якіх было не больш за 5% насельніцтва, не маглі кантраляваць гэтую тэрыторыю. Як кантраляваць краіну плошчай 1 мільён 647 тысяч кіламетраў? Гэта нерэальна. Таму яны кантралявалі гарады і руднікі, ахоўвалі транспарт, які возіць грузы.

**«НН»: Чаму Савецкі Саюз тады дапамагаў уйгурам?**

**АТ:** У адносінах да кожнага рэгіёну свету планаваліся розныя варыянты. У тым ліку на выпадак вайны з Кітаем. Шмат гадоў гэта было вельмі актуальна. Але пасля таго як развальўся сам Савецкі Саюз, уйгуры вырашылі распачаць узброеную барацьбу. Там было каля сотні розных лагераў, дзе праходзілі навучанне баевікі, існавалі нелегальныя структуры ў гарадах. Менавіта з таго часу там адбываецца вайна. Яна пачалася ў 1993 годзе. Але кітайцы нічога пра гэта не паведамляюць у сваіх СМІ. Яны паведамілі толькі цяпер аб сутыкненнях ва Урумчы, калі стала немагчыма гэта схаваць. Канечне, шанцаў у уйгураў самастойна дабіцца незалежнасці няма ніякіх...

**«НН»: Што можа дапамагчы ім дабіцца перамогі?**

**АТ:** Многія сур'ёзныя палітолагі даўно кажуць, што мы ўступілі ў паласу з'яўлення новых дзяржаваў. Спецыялісты мяркуюць, што Расія распадзецца адна з першых, таксама як і Кітай, Індыя. Што ўсе буйныя дзяржавы распадуцца. І ніякая ваенная сіла не ўтрымае. Таму што гэта працэсы, звязаныя з развіццём этнасаў. Я думаю, уйгуры будуць ваяваць і далей. Яшчэ шмат людзей загіне, шмат крыві пральецца, але ўрэшце яны вызваляцца ад кітайцаў. Недзе так гадоў праз 20-30.

**«НН»: Барацьба ідзе на ўздым?**

**АТ:** Якраз цяпер яна часова згасае. У 1993 годзе ваенныя дзеянні былі актыўныя. Кітайцы кінулі туды шмат войскаў, большую частку партызанаў знішчылі. Але падрастае новае пакаленне, праходзіць новая хваля. Усе гэта скончыцца ці перамогай, ці фізічным знішчэннем усіх мясцовых жыхароў. Уйгурам няма чаго страчваць.

**«НН»: Які быў самы жахлівы выпадак, які Вы бачылі падчас знаходжання там?**

**АТ:** Адзін раз прыйшлі ў стойбішча, дзе жылі людзі, і ўбачылі, што ўсе мёртвыя, ва ўсіх да аднаго адрэзаны галовы, рукі, ногі. Мужчыны, жанчыны, дзеці — некалькі дзесяткаў. Там пабываў кітайскі атрад. Рашэнні прымаюцца на ўзроўні якога-небудзь камандзіра роты. Няма ніякіх межаў зверству.

**«НН»: Ці можна параўнаць уйгурскую сітуацыю з беларускай?**

**АТ:** Згодна з прагнозамі некаторых навукоўцаў, у 2020 годзе (плюс-мінус год) мы ўбачым зусім іншую Беларусь і беларусаў. Калі параўноўваць з чалавечым узростам, дык наш этнас не дасягнуў яшчэ ўзроўню актыўнасці маладога чалавека. Мы цяпер як бы дзеці, але дажываем апошнія гады гэтага дзяцінства. І гэты працэс вышэйшы за асобу. Вось, напрыклад, ёсць такая з'ява, калі жывёлы масава ідуць тапіцца. Лемінгі. Калі ўзяць кожнага лемінга паасобку, змясціць у клетку, ён будзе цудоўна жыць, зусім не жадаючы тапіцца. Але гэта масавы працэс, і ён там выступае як адзінка сістэмы. Так і нацыя: кожны асобны чалавек жадае рэалізаваць нейкія свае чалавечыя мэты і думае, што ён сам кіруе сваім жыццём. Але ў выпадку, калі мы глядзім на этнас як на масу, усё, чаго жадаем мы паасобку, не мае ніякага значэння. Прыходзіць час, і пэўная частка этнасу, яго пасіянарная частка (5-6%) «стварае надвор'е». У нас цяпер, згодна з некаторымі падлікамі, колькасць пасіянарыяў не перавышае 3%. Нам патрэбна яшчэ 2%.

**«НН»: Што стане штуршком?**

**АТ:** Што заўгодна. Ёсць вельмі добры прыклад. У 1917 годзе, у канцы лютага па старым стылі, у сярэдзіне сакавіка па новым, у Расіі адбылася рэвалюцыя. У студзені Ленін яшчэ казаў, што ўсё ціха, яго партыя не мае ніякіх перспектываў на рэалізацыю сваей «праграмы-мінімум». Але ў канцы лютага ў адной з чэргаў на Неўскім праспекце жанчынам не хапіла булак. Заўважце, булак, а не хлеба. І яны пачалі абурацца. І з гэтага пачалася рэвалюцыя! І наш этнас яшчэ выйдзе на авансцэну, і гэта адбудзецца ўжо вельмі хутка.

**Гутарыла Вольга Жарнасек**



**Анатоль Тарас**

нар. у 1944 у вайсковай частцы ў Навабеліцы пад Гомелем у сям'і кадравага афіцэра савецкай вайсковай выведкі. У 1963—1966 служыў у асобным выведна-дыверсійным батальёне 7-й танкавай арміі. У 1967—1975 удзельнічаў у некалькіх аперацыях ГРУ ў розных рэгіёнах свету. У 1972 скончыў філасофскае аддзяленне БДУ, у 1979 — Акадэмію педагагічных навук у Маскве. Вывучаў метады псіхалагічнага ўздзеяння на праціўніка. Мае чорны пояс па джыу-джыцу і в'ет-ва-дао. З 1992 займаецца выдавецкай дзейнасцю. Выдаваў часопісы «Кэмпо», «Дзеды».

## СЦІСЛА

### Грунвальдская бітва падушкамі ў Мінску

Бойка падушкамі — добры спосаб зняць стрэс. Але каб падушкамі біліся публічна? Акурат так мінская моладзь мае адзначыць 599-годдзе Грунвальдскай бітвы. Ініцыятыва з'явілася ў сацыяльнай сетцы «Вконтакте». Падушачнікі збіраюцца 15 ліпеня ў 19.30 у скверы Янкі Купалы каля помніка. З сабой трэба мець падушку, альбо нешта да яе падобнае (спальнік, мяккую цацку, надзьмутага кракадзіла і г. д.). Арганізатары падзеляць усіх удзельнікаў на каманды, паміж якімі будзе адбывацца бойка. Як пад Грунвальдам 599 гадоў таму: сценка на сценку. Калі народу збярэцца, бітва напэўна трапіць на тэлеэкраны.

### У Нёмане мор рыбы

Ад залеваў рэкі разліліся, затапілі паплавы. Трава масава загніла. Ад гэтага зніжаецца ўзровень кіслароду ў вадзе. А рыба ад прадуктаў гніення травы дохне. Аналагічнае здарылася на іншых рэках Пабужжа і Панямоння. Суседзі-палякі месцамі абвясцілі стан экалагічнай катастрофы.

**НШ, МБ**



### Беларуская Дуда ў Лондане

Гэтым летам беларуская дуда гучыць у Барнэце (паўночны Лондан) у царкве Яна Хрысціцеля. Як зазвычай, улетку для наведвальнікаў адкрываецца высокая вежа царквы, з якой можна атрымаць асалоду ад лонданскіх даляглядаў у суправаджэнні беларускае музыкі. У залі царквы таксама гучаць беларускія хрысціянскія песні пад дуду. Паступленні ад квіткоў пойдуць на дабрачынныя мэты.

Наступным разам дуду ў Барнэце можна пачуць 29 жніўня аб 11-й гадзіне.

Царкву можна адшукаць па адрасе: St John the Baptist, Barnet Church, 2 Wood Street, Barnet, EN5 4BW.

**Сяржук Вінаградаў, Лондан**



# Родны кут у беларускім Паазер’і

**Пяты год у Глыбоцкім раёне прымаюць гасцей у сваёй сядзібе Юры і Юлія Бука. Для беларускамоўных наведнікаў дзейнічае зніжка.**



PHOTO.BYMEDIA.NET

Вёска Валодзькава, дзе месціцца сядзіба, знаходзіцца за 12 кіламетраў ад Глыбокага, да Полацку адсюль каля 70 кіламетраў, а да сталіцы — усе 180. Але едуць сюды з усёй краіны. Большасць наведнікаў вабіць цішыня і спакой — побач лес, возера Акунёва.

А таксама зусім невысокія, нават па беларускіх мерках, кошты — суткі пражывання ў найлепшай з хатак, дзе ёсць санвузел, газавая пліта, лядоўня, посуд і тэлевізар, каштуе 15 тысяч рублёў з чалавека.

Гэты дамок змяшчае 4—5 чалавек. У дзвюх іншых хатках выгодаў пакуль няма. У адной з іх змяшчаецца 2—4 чалавекі (цана — 10 тысяч за суткі), у другім можна прымаць вялікую кампанію да 15 чалавек (цана — па 7 тысяч з чалавека). У апошнім дамку людзі часцей спыняюцца па некалькі сем’яў на выходныя. Астатнія паслугі — за дадатковую аплату: трохразовае харчаванне — 15 тысяч, катанне на лодцы — 5, на кані (навучанне для навічкоў) — 5, лазня — 10—15 тысяч (у залежнасці ад колькасці ахвотных). Няцяжка падлічыць, што самы дарагі варыянт адпачынку ў «Родным куце» будзе каштаваць для аднаго чалавека каля 60 тысяч за суткі.

«Нашы госці кажуць, што такімі цэнамі мы толькі кліентаў палохаем — маўляў, што ж там за сэрвіс будзе за такія грошы?» — смяецца гаспадыня Юлія Людвігаўна. І тлумачыць: «Мы адмыслова трымаем невысокія цэны на паслугі, каб прывабіць больш людзей да сябе, прывучыць іх да таго, што адпачываць можна і ў нашым краі».

Гаспадары сядзібы прапануюць і зніжкі: 20% для беларускамоўных гасцей, а таксама невялікія зніжкі для гасцей з дзецьмі, для вялікіх групаў.

Засяленне ў дамкі незнаёмых паміж сабой групаў ці сем’яў без волі на тое гасцей не практыкуецца. Сядзіба дзейнічае круглы год.

Пачалося ўсё з таго, што спадарыню Юлію папрасілі размясціць у сябе мастакоў, якія пасярод зімы з’ехаліся на Глыбоччыну на пленэр.

Было гэта пяць гадоў таму, афіцыйна ж сядзіба працуе трэці год. «Некалі было так, што за сезон прыязджала ад сілы 20 чалавек, а цяпер, як дзень ніхто не прыедзе, то перажываю». Год таму ў Валодзькаве сустракалі світанак мясцовыя школьнікі. Для гаспадароў сядзібы гэта быў цікавы, але цяжкаваты досвед. «Больш такога не практыкуем, бо дзеці — гэта вялікая адказнасць», — дзеліцца ўражаннем Юлія Бука. А вось дні народзінаў ды іншыя ўрачыстасці ў іх сталі адзначаць усё часцей, задумваюцца і пра вяселлі. «Ёсць у нас праблемы, шмат што трэба давесці да ладу, але галоўнае тое, што мы ўжо маем сталых кліентаў. І гэта пры адсутнасці належнай рэкламы», — гаворыць гаспадыня. Хутка на трасе Р45 з’явіцца рэкламны шчыт з указальнікам дарогі да сядзібы.




**Замовіць дамок у «Родным куце» можна па тэлефонах:**

**8-02156-3-63-57**

**8-029-109-51-89**

«Мы заўсёды былі не такія, як усе, глядзелі на свет па-іншаму», — кажа Юлія Бука, якая жыве марай зарабляць з вёскі гадоў трыццаць. Увесь гэты час яна была пэўная, што тая прырода, ціша і спакой, якія пануюць ў іх мясцінах, проста ідэальныя для адпачынку. «Цяжкасці ёсць, але ўсё ў нас будзе добра», — з аптымізмам зазначае гаспадыня сядзібы.

**Сямён Печанко**

## На «Славянскі базар» не пускаюць з нацыянальнай сімволікай

«Славянскі базар» пачаўся для нас з сябрам зусім сумна. Больш за ўсё нас здзівіла наяўнасць штучнага інтэлекту ў віцебскіх металашукальніках і іх абслугоўваючым персанале (экспартны мінскі АМОН).

Мы былі ўражаныя іх здольнасцю адшукваць метал па колеры (і нават не метал), асабліва з выявамі нацыянальнай сімволікі. Першае, што пачуў мой сябра ад амонаўца: «Снять символику!» Пасля амонавец сарваў з яго кепку з маленькім БЧБ-значкам. Сябар забраў кепку са словамі: «Я яе зараз схаваю ў заплечнік». Але той зноў вырваў яе і, адарваўшы значак, паказаў астатнім сваім паплечнікам. Пасмяўшыся разам з імі, ён кінуў яго за плот найбліжэйшай будоўлі.

Я толькі змог прамовіць: «Што ж вы робіце, хлопцы! Гэта ж святое!» На што ён мне адказаў: «Хлопцы там, куда мы тебя посадим!» Пасля гэтага мы спрабавалі высветліць іх прозвішчы і старэйшага, але яны паклалі свае бэйджы у кішэні і, адтуршхваючы нас, сказалі, каб мы лепей зніклі.

Вось яны, навіны з «культурнай столицы Белоруссии».

**Віцяблянін**

Я толькі змог прамовіць: «Што ж вы робіце, хлопцы! Гэта ж святое!» На што ён мне адказаў: «Хлопцы там, куда мы тебя посадим!»

## «Летува» і «Літва»

**Нам трэба перастаць рабіць сабе шкоду, называючы нашую паўночна-заходнюю суседку нашым жа гістарычным, а можа, яшчэ ў прыйсці і вернутым імем «Літва».** Замест гэтага давайце іх называцьмем так, як яны сябе самі ахрысцілі, г.зн. «Летува, летувіс, летувіскі».

Я не сумняюся, што вы разумееце значэнне прыпамненняў гэтае праўды для ўздыму й захавання нацыянальнае свядомасці, а таксама пашаны да гістарычнае спадчыны сярод нашых суродзічаў ды возьмеце маю прапанову на ўвагу, за што я й нямала маіх аднадумцаў, а ў прыйсці, можа, й увесь наш народ будзем вам моцна ўдзячныя.

**Барыс Данілюк, yahoo.com**

**Ад Рэдакцыі:** Беларусы маюць роўныя правы на спадчыну ВКЛ з іншымі народамі Вялікага Княства. Гэтага факту сёння не адмаўляе нават нашая афіцыйная гістарыяграфія. І ўсведамленню гэтага ніяк не перашкаджае той факт, што паўночназаходняя суседка Беларусі называецца Літвою. У найноўшы час нашая дзяржава паўстала на грунце менавіта беларускага нацыянальнага руху. Як Беларусь яе акрэсліваў Багушэвіч. Браты Луцкевічы запачаткоўвалі Беларускую сацыялістычную грамаду і беларускую газету «Наша Ніва». І за вызваленне ад царскага ярма яны змагаліся поплеч з дзеячамі літоўскага нацыянальнага руху. Уздым жа самасвядомасці, пра які Вы пішаце, не дасягаецца зменай літараў. Гісторык Зміцер Віцько даводзіць: «сцвярджаць, што «Lietuva» і «Літва» — розныя паняцці, — тое самае, што размяжоўваць «England» і «Англію». Пацікаўцеся, калі ласка, яго публікацыяй і шэрагам тэкстаў на гэтую тэму ў часопісе ARCHE №5 за 2009 год.

## Не хапае пенсіі, каб пражыць

**Мая жонка адпрацавала 45 гадоў у бальніцы. Ветэран працы, атрымлівае 280 тысяч. Можна пражыць на такую пенсію?** Канечне, не. Заплаціць за тэлефон, ваду, купіць дровы, адрамантаваць плот. Пасадзіць на такі пражытачны мінімум любага рангу вертыкальшчыка ці чыноўніка, каб ён пражыў хаця 6 месяц, потым ён дазнаўся б, як можна жыць.

**Павал Давыдзенка, Парычы, Светлагорскі раён**

## Крытыкам Мілінкевіча

**У Беларусі пачалася падрыхтоўка да будучых прэзідэнцкіх выбараў, і ў шэрагах апазіцыі, з падачы журналіста Падалякі, пачалася канкурэнтная барацьба.** Вастрыня ўколаў абрынулася на былога адзінага кандыдата ад апазіцыі Аляксандра Мілінкевіча.

Галоўнае абвінавачанне супраць А.Мілінкевіча палягае ў тым, што ён прэзідэнцкую кампанію правадзіў млява, не павёў народ на барыкады, а павёў да вечнага агню і не перамог…

Але крытыкі чамусьці замоўчваюць, што быў і другі кандыдат ад апазіцыі — Аляксандр Казулін, які таксама не перамог, а павёў народ на Акрэсціна, дзе ў час шэсця ўлады збілі людзей,а потым пасадзілі ў турму. Як бачым, дзве тактыкі двух апазіцыянераў з рознымі вынікамі.

Няўдача апазіцыі ў прэзідэнцкай кампаніі 2006 г. крыецца не ў асобах Мілінкевіча ці Казуліна, а ў тым, што ў той час грамадства было не гатовае да зменаў і баявыя лозунгі не падтрымала б, калі б яны і былі. У сучасны момант не можа быць адзінага кандыдата ад апазіцыі, бо, як і ў 2006 г., назіраюцца два кірункі апазіцыйнага руху.

Адзін, вобразна кажучы, — «Усё, альбо нічога!» Гэта значыць адразу памяняць рэжым на дэмакратычны, прыняўшы да выканання 12 умоваў Еўрасаюзу, на што рэжым ніколі не пагодзіцца, бо ні адзін дыктатар без бою ўладу не аддаваў!

А другі кірунак — гэта кірунак А.Мілінкевіча і Еўрасаюзу на сучасным этапе, які вызначаецца пакрокавым уцягваннем Беларусі ў Еўропу, вымагаючы ад існага беларускага рэжыму саступак у абмен на эканамічную і палітычную падтрымку Беларусі ў супрацьстаянні з імперскімі памкненнямі Расіі, што аб’ектыўна ўмацоўвае незалежнасць Беларусі. Гэта і ёсць палітыка Усходняга партнёрства, у выпрацоўцы якой былі значныя намаганні і А.Мілінкевіча, які нездарма ездзіў да кіраўнікоў еўрапейскіх краін на перамовы. Мы ўжо маем некаторыя вынікі гэтай дзейнасці ў тым, што «Народная воля» і «Наша Ніва» прадаюцца ў шапіках, вызваленая большасць палітвязняў, Захад стаў даваць крэдыты і г.д. Працэс пайшоў, а крытыкам раю не шукаць у А.Мілінкевіча парушынку, а рабіць свой унёсак у нашую агульную справу змагання за незалежнасць і дэмакратызацыю Бацькаўшчыны. Заўсёды трэба памятаць, што незалежнасць — гэта галоўнае. Без незалежнасці не можа быць ніякай дэмакратыі, а таму ў першую чаргу трэба змагацца за незалежную Беларусь.

**Мікалай Куксо, Івянец**

## ВОДГУКІ

## «Вярніце мову», №23

Дзякуй за Зварот, у нас супала ініцыятыва — я не толькі стала карыстаюся беларускай мовай па-за працай, але ўжо два тыдні вяду прыём грамадзян як рэгістратар нерухомасці па-беларуску. Некаторыя ад гэтага ў захапленні, некаторыя пытаюцца «чаму», і толькі «казахі» просяць перайсці на расійскую. За год не бачыў такого ўздыму настрою і ветлівасці кліентаў — калі чуюць ад рэгістратара нерухомасці РУП «Гарадское агенцтва па дзяржаўнай рэгістрацыі і зямельным кадастры» беларускую мову.

З Богам!

**Мікалай Арцюхоў, gmail.com**

«НН» з радасцю друкуе ў газеце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаванні. З прычыны вялікага аб’ёму пошты мы не можам пацвярджаць атрыманне Вашых лістоў, не можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адрасу. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам.

**Наш адрас: а/с 537, 220050 Мінск. e-mail: nn@nn.by. Факс: (017) 284-73-29**

## Створым першы беларускі клас

**Як вядома, жыццё развіваецца па спіралі, некаторыя падобныя праявы яго паўтараюцца праз пэўны перыяд.** Мы цвёрда ўпэўненыя ў тым, што новы віток адраджэнскага руху, які выведзе Беларусь на «пачэсны пасад між народамі», не за гарамі.

У 1993 годзе ў першых беларускамоўных класах навучалася 76% ад усіх першакласнікаў, а ў сталічнай вобласці — нават 92,6%. Тыя, хто навучаўся тады, ужо самі робяцца бацькамі і аддаюць сваіх дзяцей у дашкольныя ўстановы з беларускай мовай навучання і выхавання, першыя беларускія класы. Пра свой намер адкрыць новыя групы і класы заявілі праз СМІ нашы актывісты ў Мінску, Гродне, Магілёве, Лідзе.

У Мінску прымаюць заявы не сем адукацыйных установаў з беларускай мовай навучання. Сёлета навучанне па-беларуску вялося ў 18-ці агульнаадукацыйных установах: гімназіях № 4, 9, 14, 23, 28, гімназіі-каледжы мастацтваў, СШ № 11, 60, 68, 72, 89, 108, 131, 180, 190, 205, 209, 218. Можна працягнуць і лік дашкольных установаў сталіцы акрамя названых у СМІ, напрыклад, 533, 133 і інш.

Як паказвае досвед, поспех стварэння новых навучальных і выхаваўчых суполак у адукацыйных установах у вялікай ступені залежыць ад актыўнасці і прадпрымальнасці зацікаўленых бацькоў. Дык за справу! У сваю чаргу, Таварыства беларускай школы знойдзе магчымасць у пачатку навучальнага году маральна падтрымаць найлепшых актывістаў, новыя беларускія класы і групы ў садках краіны.

Дасылайце інфармацыю пра актывістаў стварэння беларускіх класаў і груп у дашкольных установах на адрас ТБШ: tbskoly@tut.by ці тэлефануйце (29) 752-08-21 да 15 верасня 2009 г.

**Алесь Лозка, старшыня Таварыства беларускай школы**

# Беларусь у I—VII ст. н. э. Варварская перыферыя Рымскай імперыі. У складзе дзяржавы готаў і Аварскага каганату. Праблема паходжання славянаў

# Гісторыя Беларусі



Выява аварскага вершніка.

**Алег Дзярновіч** распачынае публікацыю артыкулаў са сваёй будучай кнігі «Гісторыя Беларусі».

## Экзатычныя пачаткі

Сучасная гістарычная свядомасць звязвае раннюю гісторыю Беларусі ў I тысячагоддзі н. э. — напярэдадні ўзнікнення дзяржаўнасці — з узаемадзеяннем балтаў і славян. Як і калі апошнія з'явіліся на балцкіх абшарах Беларусі, наколькі мірнымі былі іх кантакты, у чым прычына перамогі ўрэшце славянскай мовы?



На наканечніку кап'я III ст. маецца рунічны надпіс, зроблены на гоцкай мове — tilarids, што азначае «напад», «той, хто нападае».

Але перш чым перайсці да гэтых пытанняў, звернем увагу на геакультурны фон тагачасных падзеяў, што былі не менш каларытнымі, а з глядзішча сённяшняга часу — і экзатычнымі.

Не трэба забывацца, што тагачасныя землі Беларусі былі часткай варварскай перыферыі Рымскай імперыі. І справа не толькі ў знаходках рымскіх рэчаў ды манет — працэсы наступу варвараў на Рым і постантычны свет ды перасяленні народаў так ці інакш закранаалі тэрыторыю будучай Беларусі.

## Готы

У пачатку нашай эры ўсходнегерманскае племя готаў перасялілася са Скандынавіі на паўднёвае ўзбярэжжа Балтыйскага мора. Прасоўваючыся ўздоўж Віслы і Буга, готы асімілявалі мясцовае насельніцтва — у выніку, паводле тэрміналогіі археолагаў, утварылася вельбарская культура. Помнікі гэтай культуры, а найперш могільнікі, пакінутыя готамі і роднаснымі ім гепідамі, маюцца і на тэрыторыі Брэсцкага, Камянецкага і Столінскага раёнаў.

Для нас гэты сюжэт важны яшчэ вось чаму. У літоўскай мове для пазначэння беларусаў зноў сталі актыўна выкарыстоўваць архаічнае слова *гуды*. Сярод жа многіх лінгвістаў пашыранае меркаванне, што слова *гуды* хутчэй за ўсё паходзіць ад найменя *готы*. У эпоху Вялікага перасялення народаў готы ўключылі ў сваю арбіту таксама насельніцтва, магчыма, славянскае, што жыло на паўднёвым захадзе сучаснай Беларусі, на Палессі, ды было суседзямі балтаў. У выніку назва «готы» пашырылася на ўвесь саюз плямёнаў, падуладных готам.

Але ў 375 г. гоцкае квазідзяржаўнае ўтварэнне караля Германарыха было змецена ордамі гунаў, якія рушылі ў Еўропу. Адступілі таксама готы, але іх сляды — археалагічныя помнікі ды назва народа — засталіся на нашай зямлі.



Так выглядалі авары (рэканструкцыя).

Варта дадаць, што готы — гэта лацінская назва (Gothi). Самі яны сябе звалі Gutans, Gytos. Вось адкуль «гуды» ў літоўскай мове. Вось адкуль у Беларусі Гудагай, Гудзевічы, іншыя паселішчы з гэтым коранем у назве.

У свой час Зянон Пазняк вельмі негатыўна выказаўся супраць называння ў літоўскай мове беларусаў *гудамі*, бо да гэтага тэрміну можна падабраць у якасці сіноніму слова «адсталы». А сугучнае літоўскае *gūdus* перакладаецца як *жудасны*.

У беларускай мове засталося не так і мала пазычанняў не проста з германскіх моваў, а менавіта з гоцкай. Літоўска-амерыканская даследчыца Марыя Гімбутас залучае да гоцкіх пазычанняў у славянскіх мовах шэраг тэрмінаў, звязаных з хатняй гаспадаркай: hlevu — хлеў, hlebu — хлеб, kotilu — кацёл. Таксама сустракаюцца важныя эканамічныя тэрміны: dulgu — доўг, lihva — прыбытак, ліхвярства. Не забудземся на вайсковыя тэрміны: meci — меч і helm — шлем.

Гоцка-германскія пазычанні сведчаць, што паўночныя прыхадні спрыялі цывілізацыйнаму развіццю славянаў. Колькасць славянскіх пазычанняў у германскіх мовах нязначная ў параўнанні з колькасцю германскіх словаў у славянскіх мовах. Готы палітычна і культурна пераўзыходзілі славянаў ды сапраўды сталі моцна паўплывалі на матэрыяльную і духоўную культуру сваіх падданых.

У сваю чаргу гуны, пераможцы готаў, адчулі пэўнае ўздзеянне славянаў. Апошнія ўваходзілі ў саюз плямёнаў, які пад агульным найменнем гунаў уварваўся на еўрапейскія абшары і даў штуршок Вялікаму перасяленню народаў. Гоцкі гісторык VI ст. Ярдан апавядае, як падчас пахавання «біча Божага» — вялікага правадыра гунаў сярэдзіны V ст. Атылы — гуны памінаці яго па-славянску: «Пасля таго як ён быў аплаканы такімі стогнамі, яны спраўляюць на ягоным кургане «*страву*» (так называюць яны гэта самі), суправаджаючы яе велізарным пірам». Страва ў арыгінале так і запісаная — strava.

Каб скончыць з гунамі, варта згадаць, што ў скандынаўскіх сагах згадваецца аблога Полацку іх войскам. Хто ведае? Археалагічныя звесткі пра найстарэйшы горад Беларусі далёка не поўныя...

## Аварскі штуршок

Яшчэ адны прыхадні-качэўнікі з Усходу маюць непасрэдныя адносіны да беларускай гісторыі. Авары з'явіліся ва Усходняй Еўропе ў сярэдзіне VI ст. Сярод гісторыкаў і лінгвістаў працягваюцца дыскусіі пра паходжанне гэтага племені ці, хутчэй, саюзу качавых народаў — былі яны цюркамі альбо іранамоўнымі. Але манголоідныя антрапалагічныя рысы ў іх абліччы былі выразныя. Так ці інакш, аварскаму кагану Баяну ў 562 г. удалося стварыць у Паноніі, на тэрыторыі будучай Венгрыі, магутны Аварскі каганат, пад знакам гегемоніі якога працякала гісторыя Цэнтральнай і Усходняй Еўропы ў другой палове VI — VII ст. Менавіта пад уладай аваў апынуліся славяне Падунаўя і прылеглых тэрыторый. І адтуль, імкнучыся ўхіліцца ад ціску сваіх новых уладароў, яны пачалі рассяляцца. Славянскія масы прыйшлі ў рух, адна хваля іх міграцыі скіравалася на поўдзень, на Балканы, ва ўладанні Візантыі, другая — на поўнач і на паўночны ўсход, аж да Беларусі.

Перыяд аварскай гегемоніі моцна адбіўся на славянах, прынёсшы ў іх сацыяльны лад рысы вандроўнага мілітарызму. Толькі ад аварскіх часоў разам з ваярамі-вершнікамі пачынаюць хаваць іх коней. Страмёны ў славянаў вядомыя таксама з аварскага перыяду.

## Славянская праблема

Паходжанне народаў застаецца складанай тэмай для гісторыкаў, археолагаў, этнолагаў, лінгвістаў. Але са славянамі, у адрозненне ад іншых індаеўрапейцаў — індаарыйцаў, германцаў, балтаў, — зусім няма пэўнасці. У наш час не існуе агульнапрынятай версіі фармавання славянскага этнасу.

Славяне ўпершыню былі зафіксаваныя ў пісьмовых (візантыйскіх) крыніцах толькі ў сярэдзіне VI ст. — на 600 гадоў пазней за балтаў і на 700 гадоў пазней за германцаў. Самыя раннія сведчанні апісваюць народ, што падзяляецца на дзве часткі — склавінаў і антаў, якія гавораць адной мовай.

Лінгвісты ж не маюць адзінай думкі што да з'яўлення тае мовы, якую можна лічыць славянскай ці праславянскай. Навуковыя версіі прапануюць у якасці часавага дыяпазону вылучэння такой мовы з праіндаеўрапейскай ці прабалцкай шырокі перыяд ад II тысячагоддзя да н.э. да першых стагоддзяў н.э.

Вывучэнне этнагенэзу славян з дапамогаю археалогіі сутыкаецца з наступнаю праблемаю: сучасны навуцы не ўдаецца прасачыць у перыяд да нашай эры змену ці пераемнасць археалагічных культур, носьбітамі якіх можна было б упэўнена лічыць славян ці іх продкаў.

Усё ж на базе параўнання архаічных моўных пластоў усё часцей робяцца высновы, што протаславянская мова вылучылася з перыферыйных прабалцкіх гаворак. Беларускі лінгвіст Віктар Мартынаў удакладняе — заходнебалцкіх.

Працэс рассялення славян з невялікай тэрыторыі на велізарныя абшары Еўрапейскага кантыненту — адна з самых яркіх старонак старажытнай гісторыі народаў. Марыя Гімбутас так ацэньвала гэтыя тэктанічныя працэсы: «Пастаўшы як нязначная індаеўрапейская група, якая жыла на поўнач ад Карпацкіх гор, <...> славянскія земляробы здолелі выжыць толькі дзякуючы сваёй упартасці. Урэшце ім удалося засяліць шырокія тэрыторыі Цэнтральнай і Усходняй Еўропы, а таксама Балканскі паўвостраў. Іх уварванне не стала асобным эпізодам кшталту нерэгулярных набегаў гунаў і авараў, а было планамернай паслядоўнай каланізацыяй».

Пра балтаў і скандынава—русаў чытайце ў наступных выпусках «Гісторыі Беларусі».



# Тацяна Беланогая: простыя рэчы

**Здаецца, бард-рокерка Таня Беланогая не імкнецца быць арыгінальнай. Затое ў шчырасці яе мудрая прастата ёсць — быць самім сабой. «Я хачу банальшчыны: мора, месячнай сцяжынкі, пясочку, кахаць і быць каханай».**



Спаткаліся мы напярэдадні Танінага ад’езду ў роднае Маладзечна. Таня радасная: электрычка — не метро. Там будуць прыгожыя далягляды, і кніжку нарэшце пачытаць можна.

## Тата-нефармал

Дзяцінства Таніна — маладзечанскі інтэрнат з доўгім калідорам, на 26 пакояў. Матуля, сястра, тата і Высоцкі, Бутусаў, Аркадзь Северны. Штодзень у тым пакойчыку, адным-адзіным, спяваюць. Гэта ўсё тата, «схаваны нефармал»!

Ну а сябе Таня ўзгадвае непаслухмянай, нават шкодніцай. Магла брата падставіць: шукае на целе ранку, каб атрымаў той. А яшчэ дзяцінства Таніна — гэта любоў мамы і таты. Таму і ў інтэрнацкім пакойчыку цесным была свая шчаслівая паўната.

«У мяне і цяпер вельмі моцнае адчуванне, што ёсць сям’я. Мы з сястрой прыязджаем да бацькоў — і быццам бы гэта наша крэпасць. Не сцены, не шпалеры, не новая мэбля, а ў паветры нейкі эфір немажлівы! Задыхаешся ад кахання. Я ўдзячная Богу. Гэта мудрасць маці і таты, каб захаваць сям’ю і вырасціць дзяцей!» Таня ўвогуле ўпэўненая, што любоў — гэта самае галоўнае. Не варта без любові горад будаваць...

Штолета была вёска з бабуляй, вялікай бібліятэкай, цёткі — выкладчыцы сусветнай мастацкай культуры. «Памятаю, любіла гартаць кніжку пра Антаніёні, з палкімі чорна-белымі кадрамі фільмаў. Гэта быў нейкі патаемны ход у іншае вымярэнне. Што за бязглуздзіца, але ж цікава! Потым пачала разумець, хто гэта і навошта. Любіла Жорж Санд, асабліва яе біяграфію».

У гадоў чатырнаццаць знайшла кніжку Анатоля Сыса. Не захапілася, але запомніла. Пазней, ужо студэнткай, адкрыла: Сыс — Паэт! Побач з Сысам у яе сэрцы змясціліся яшчэ два паэтычныя каханні — Саша Башлачоў і Лера Сом.

«Проста гэта такія паэты... Нават не растлумачыш! Такая паэзія, якая над паэзіяй! Вось кніжка — а над ёй пара, як туман! Паэзія, як эфір, нябачная».

У вёсцы Таня ведала, што не мусіць ісці тусавацца з усімі на лавачках. Гэта — неяк няправільна.

«Не умею сябе паводзіць у вялікай кампаніі! У тусоўках страчваецца глыбіня, губляюцца вочы, і мне вельмі балюча. Паасобку людзі прыгожыя, а калі іх шмат, я не бачу гэтай прыгажосці».

## У школцы памыляцца нельга

Калі заплята лі Тані хвосцікі ў школку, дык плакала яна. «Ненавідзела ў дзяцінстве школу, там было страшна, там нельга было памыляцца». А Таня — дзяўчынка гіперадказная. Выдатніца. Урокі не зробленыя — на вуліцу не ідзе, спаць не кладзецца.

«Я і цяпер на працы ўсе дакументы тры разы пераправеру. Але калі палюбіць сябе і зразумець, што гіперадказнасць — гэта нармалёвы стан, то не так ужо і дрэнна тады».

## Паступіла на прыродазнаўчы факультэт — і заплакала

Было ў Тані памкненне стаць рэстаўратарам, ды зрок дрэнны. У філалагі памкненне было падацца. Але — сшыткі правяраць!

І паступіла на прыродазнаўчы факультэт. Паступіла — і заплакала. Студэнткай была павярхоўнай: каб адгарадзіцца ад акадэмізму універсітэцкага тужлівага. Затое як выходзіла да дошкі — аднагрупнікі ўсміхаліся. Не магла яна сур’ёзна пра будову ліста, кселему і флаэму. Тані хацелася пра іх спяваць! Затое ва універсітэце была мілая сэрцу геаграфія і знайшліся сапраўдныя сябры — фатограф Віталь Матусевіч, Дзяніс і Зміцер з гурта «Рахіс». Яны і завялі Таню ў Задзіночанне беларускіх студэнтаў, дзе спаткалася так шмат светлых людзей. І свае першыя канцэрты бард-рокерка грала ў ЗБСе.

## Я — бабулька старэнькая, у вачах якой зямля адгукаецца

А да беларушчыны Таня прыйшла праз каханне. Яе хлопец захапляўся «N.R.M.» «Памятаю, як «Одзірыдзідзіну» слухала. Якое вар’яцтва, але як гэта цудоўна! І пачало прыходзіць: гэта мая музыка, я беларуска...» Каханню дзякуючы і спевы Таніны нарадзіліся. «Я моцна кахала ў жыцці. Але нічога, акром песняў, з майго кахання не выйшла... Ну, а для жанчыны ж каханне — гэта асноўнае».

Таня марыць кахаць і быць каханай. Са студэнцтвам не так даўно развітаўшыся, яна ў дарослае жыццё крочыць. І як бы ёй тут шчырай застацца. Па правільных касмічных законах развівацца. І каб усе былі шчаслівымі, здаровымі — аб гэтым Таня Беланогая марыць.

Яе палохаюць кампутары. «Людзі ў зацікаўленасцях livejournal пішуць: «гуляць пад дажджом, збіраць лісцікі». Страшна мне ад гэтых фразаў! Яны сядзяць у гэтым ЖЖ, а пад дажджом не гуляюць! Людзі накупілі кампутараў, пішуць такія фразы, а так шмат няшчасцяў...»

Натхняе яе тэатр з глыбокім сэнсам. І Бог натхняе. «Я Бога па-свойму ўспрымаю, праз дарогу, праз бабулю, праз дом. Бог — мой першы сябра. Малітвы заўжды са мной. Без храму я б ніводнага канцэрту не сыграла. Прыйдзеш у царкву, калі закахалася, і просіш для гэтага чалавека ўсяго самага добрага альбо просіш у Бога добрай дарогі».

З узростам Таня прыходзіць да ісціны: нічога ў жыцці не дадзена проста так, а дадзена, каб мы вучыліся. Урок, адчувае яна, можа ісці ў двух кірунках: у бок азлоблення, непрыняцця, калі застаешся дзіцем, якому усё нешта не так, альбо ў бок моцы, спакою.

А з кім і з чым атаясаміць сябе можа? З бабулькай. «Ідзе яна ў вёсцы, і такая прыгажосць! Нейкі дыялог у сабе нясе, думае пра нас усіх, пра кароўку сваю, пра козачку думае... Быццам бы зямля, быццам ўсё ў яе вачах адгукаецца».

**Кацярына Безмацерных**

## ДЫСКАГРАФІЯ

### Алесь Камоцкі

Песні як жыццё. Лепшае і невядомае, БМА-груп, 2009




У гэтым дыску тры розныя Камоцкія.

Нешта зарана спісалі Камоцкага — складанка яго спеваў выйшла ў серыі «Беларускі музычны архіў». Такога дыску вой як не ставала. Частка альбомаў Алеся так і засталася самвыдатам, іншыя сталі рарытэтам. Тут сабраныя спевы розных часоў, на вершы Караткевіча, Багдановіча, Барадуліна, Жылкі ды ўласна Камоцкага. Увогуле, у гэтым дыску тры розныя Камоцкія. Першы, найбольш вядомы і блізкі тым, каму цяперака за сорак, — з гітараю. Другі — імпазантны шансанье ды з ансамблем (шкада, няма зусім новага Камоцкага — басановістага). Трэці — і не Камоцкі зусім, а яго ўвасабленні: на словы выканаўцы пяюць Вайцюшкевіч, Стэфан і нават Лісіцкая з Грыбалёвай («Мурку» з «Батлейкі», шкада, сюды не ўключылі).

Поўнае ўяўленне пра гэтую асобу дыск «Песні як жыццё» не здольны даць, але нейкія штрыхі да партрэту — цалкам імаверна. Не стае разынкі, якая выкарыстоўваецца якраз у дысках гэтай серыі — проста голасу творцы, якому прысвечаная праграма. Але дыск не будзе лішнім нават тым, хто ведае на памяць «Просьбу», «Сані» і «Зорку босую».

### CherryVata

ViaVanilla, Go-Records, 2009




Песні на мове ўсходняга суседа падаюцца маргінальнымі.

Цягам праслухоўвання дыску пераследуе адчуванне, што гучаць падзабытыя героі чартаў сярэдзіны 90-х. Альбом цяжка назваць своечасовым, але пра адсталасць казаць падставаў яшчэ менш. Імаверныя прэтэнзіі разбівае неместачковасць матэрыялу, чым рэдка могуць пахваліцца англамоўныя праекты нашай краіны. Найперш вылучаюцца дзве-тры фантастычна запамінальныя мелодыі (тут гэта «Sea» і «Outro»), а з кожным новым праслухоўваннем пачынаюць квітнець іншыя трэкі, што падаваліся спачатку шэрымі. Шляхам эксперыментаў па спалучэнні жывога і электроннага гучання ім трэба ісці далей. Важна забыцца на расійшчыну. Песні на мове ўсходняга суседа падаюцца маргінальнымі. А ў цэлым, гурт, які стварыў такую песню як «Sea» (хай яна і пяць разоў будзе падобная да кагосьці там), варты максімальна магчымай павагі. Гэты твор не згубіўся б ні ў якім хіт-парадзе свету.

### In search for

Faith, БМА-груп, 2009



Трапляе ў самае сэрца.

Ян Жанчак пайшоў па шляху Ялфімава — пайграў у «Песнярах» ды ўзяўся за сольны хард-рок-праект. Дэбютнік «Faith» можна назваць старамодным у станоўчым сэнсе. Па гучанні ён нагадвае апошнія альбомы Deep Purple (на гітары яўны паслядоўнік Стыва Морса). Недзе побач прабягаюць Мэрк’юры, Мулявін і Уотэрс. Відаць, за аснову альбому ўзяты саўндтрэк да эксперыментальнага спектаклю Ларысы Сімаковіч — таго, дзе Святлана Зелянкоўская выконвала ролю Максіма Багдановіча (ці гэтая музыка была проста скарыстаная ў «Дні Багдановіча»).

Жанчак — вакаліст і меладыст не абы-які. Яго музыка трапляе ў самае сэрца, асабліва «Skyes in your Eyes» і цэнтральная тэма «Дня Багдановіча» — «Каханне», выкананая разам з Сімаковіч. А вось «Пі да дна» на Арсенневу гучыць надта ўжо штучна. Шкада, што вакальныя магчымасці кіраўнічкі «Госціцы» болей не скарысталі, яна эпізадычна з’яўляецца яшчэ ў двух трэках.

«In search for» яўна любяць вялікія музычныя формы — пяты і дзесяты трэкі па дзесяць хвілінаў кожны. Маштабнасць падачы вымагае дасканаласці гучання, але з гэтым якраз праблема. Усе шурпатасці выдатны голас Жанчака не здольны прыкрыць. І яшчэ адно — дыск не пакідае цэласнага ўражання. Адчуванне, што музыкі, пры ўсёй любові да такога кшталту музыкі, пакуль не знайшлі сябе.

### Фолк-мадэрн Беларусі

Будзьма, 2009




Дыск з шэрагу «зляпіла з таго, што было».

Складанка. Выканаўцы падзеленыя на тры блокі: пост-фолк (яго прадстаўляюць «Палац», OSIMIRA і «Грамніцы»), фолк-рэміксы («Стары Ольса» з DJ Антонам Міксам) ды фолк-рок (UNIA, LitvinTroll, Vicious Crusade). З «Троіцай», UR’IA, Akana, Guda, «Джамбібум», пэўна, не дамовіліся. Дыск з шэрагу «зляпіла з таго, што было»: большасць трэкаў выдаваліся і добра вядомыя (але чамусьці назвы іх змененыя — песня «Русалкі» ў выкананні «Палацу» завецца тут «На граной нядзелі», а «Крынічанька» ад UNIA атрымала назву «Ой, жаль, жаль мне будзе»). Няўцямная пабудова дыску — адкрывае «Палац», потым «Палескі танок» ад OSIMIRA, затым ізноў дзве песні «Палацу». Калі ставілася мэта паказаць разнастайнасць айчыннага фолку — выйшла досыць шэра, хоць сам матэрыял (асабліва «Стары Ольса» ў дэнс-варыянце) вельмі харошы.

**Сяргей Будкін**

# Глушчына. Але не глуш

**Як і ў Мінску. Толькі паветра чысцейшае. Вандруем па маршруце Завалочыцы—Гарадок—Калацічы—Глуск разам з Сяргеем Харэўскім.**

Глушчына — край чысты і маляўнічы, працяты млявай, але паўнаводнай Пціччу, што віхляе па нізкіх смарагдовых паплавах. Уздоўж яе берагоў усё даўно абкультурана, асушана і абкошана. Але варта ад'ехаць ад Пцічы паўтузіну кіламетраў убок, і вас абступяць старыя калматыя лясы, поўныя ягад і грыбоў... Паветра тут абсалютна чыстае. Да чыгунак далёка. А вось нафту здабываюць! Тутака ёсць больш за 20 свідравін, што эксплуатуюцца. На сапраўдных нафтавых вышках, рыхтык як у Азербайджане, ідзе здабыча сыравіны, што потым трапляе ў 30-кіламетровы нафтаправод. Глускі раён — адзіны ў Магілёўскай вобласці, дзе здабываюць нафту.

Як з'ехаць з колішняга Варшаўскага тракту, паміж Глушаю і Старымі Дарогамі, на поўдзень, то адразу і будуць Завалочыцы. Там можна паглядзець колішні панскі маёнтак Жылінскіх са старадаўнім палацам, і курганы, курганы, курганы па ваколіцах....

Вялікі прыгожы палац — і цяпер галоўная рэліквія і гонар Завалочыцаў. Пакаштуйце, калі пашчасціць, завалачанскага мёду і малака, прайдзіцеся па ваколіцах, старых могілках, берагамі Пцічы, усцяж сакаўных паплавоў, пасядзіце надвячоркам з вудаю...

За Завалочыцамі, як пераехаць новую шашу на Бабруйск, можна заехаць у Дварэц, сімпатычную, але цяпер ужо лядашчую вёску. Тут таксама застаўся рамантычны старасвецкі парк, рэшткі вялікага палацу, колькі старадаўніх будынкаў між прысадаў. Гэта была яшчэ адна сядзіба Жылінскіх, але летняя, для адпачынку. Стары драўляны палац нэўзабаве развальіцца дарэшты... Разьбяныя ліштвы, рэшты элеганцкае шалёўкі, аканіцы, драўляныя карункі ўдоўж гзымсоў. А на экзатычнай старой лістоўніцы буслы збудавалі гняздо. Каб жа ж і людзям узяць прыклад ды не даць прапасці такому помніку, ашчадна дагледзець яго, як бусел сваю буслянку. Тут чысцюткія ваколіцы, экзатычны стары парк, колькі азёрцаў, шыкоўныя краявіды разлогаў над Пціччу... Няма толькі гаспадара.

Недалёка ад Дварца, пры паварoце на сам Глуск, ляжыць над Пціччу вёска Гарадок. У яе ваколіцах знойдзена два дзесяткі курганоў бронзавага веку. Курганы, пагоркі, валатоўкі тут паўсюль. Ды і сам Гарадок стаіць на высокім пагорку, над стромым берагам Пцічы, што адсюль робіцца раптам шырэйшаю і глыбейшаю.

На заходняй ускраіне вёскі стаіць самы стары храм, адзіны ацалелы па савецкай уладзе не толькі на Глушчыне, але і на ўсіх берагах Пцічы. Казьмадзям'янаўскую царкву пабудавалі ў 1814 годзе ў гонар перамогі над Напалеонам.


**Царква ў Гарадку — унікальны для рэгіёну помнік драўлянага дойлідства.**

Царква ў Гарадку — унікальны для рэгіёну помнік дойлідства з выкарыстаннем элементаў класіцызму. Храм на высокім падмурку складаецца з малітоўнай залы пад вялікім купалам, пяціграннай апсіды, званіцы і бабінца. Галоўны ўваход зроблены як класічны порцік. Унутры купал падтрымліваецца слупамі. У Казьмадзям'янаўскай царкве засталіся й цікавыя разьблёныя аздобы. За царом у Гарадку быў самы вялікі ў ваколіцах прыход. Дзіва, але за сваю амаль дзвюхсотгадовую гісторыю гэтая царква ніколі не зачынялася. Нават за саветамі — тутэйшы святар, айцец Георгій Семянюк, быў ветэранам вайны і здолеў адстаяць свой прыход. Царква да сёння застаецца самай шанаванай святыняю, да якой імкнуцца пілігрымы. Перадусім на 14 лістапада, тутэйшае прастольнае свята.

Калі ехаць далей уздоўж Пцічы, пад самым Глускам будзе вёска Калацічы. Цяпер яе прахарашылі, абралі ў якасці ўзорнага аграгарадка, то бок увалілі грошай... Дом культуры робіць уражанне. Тут цяпер дзейнічае ажно тузін клубаў і фальклорных калектываў!

А ў гісторыю нашае культуры Калацічы ўвайшлі перадусім як радзіма Альгерда Якуба Абуховіча, графа Бандынэлі, аднаго з пачынальнікаў нашае новае літаратуры. Абуховіч пражыў незвычайнае жыццё — вучыўся ў Слуцкай кальвіністкай гімназіі, доўга жыў у Жэневе, браў удзел у паўстанні 1863 г., быў высланы ў Сібір, а па вяртанні настаўнічаў у Слуцку. У Калацічах помніка Абуховічу пакуль няма. Але жыве найсакавіцейшая, сапраўдзічная наша мова. І мясціны тут сапраўды прыгожыя.

Пакуль у Глуску ўсталявалі помнік толькі Сяргею Грахоўскаму. Дзіцячыя, школьныя гады ягоныя прайшлі менавіта ў гэтым мястэчку, якому ён прысвяціў немалую частку сваіх твораў. Помнік стаіць на светлым і дагледжаным бульвары пасярод мястэчка. Наагул гэты бульвар — сапраўдны гонар Глуску. Тут і разнастайныя, часам дзіўныя аздобы, і шыкоўныя кветнікі.

Глуск — старажытнае мястэчка, што згадваецца ўжо з XV стагоддзя. У XVII ст., калі горад быў дазвання знішчаны казакамі, князі Палубінскія пабудавалі тут магутную мураваную цытадэль з бастыёнамі. Маштаб замку быў такі, што сёння пасярэдзіне лёгка змясціўся раённы стадыён.

У Глуску і сёння вам апавядуць пра падземныя хады са скарбамі, пра шкілеты, чарапы, невераемнай даўжыні лабірынты... У Сяргея Грахоўскага ў апавяданні «Касцёл» гаворыцца, што нібы дзед казаў, што ад касцёлу да Гарадку ідзе патаемны ход, у які схаваныя жалезныя куфры з золатам і каштоўнымі камянямі, там жа замуроўвалі ворагаў і здраднікаў, душы якіх стогнуць па начах. З замкавых валоў, усярэдзіне якіх схаваныя мураваныя пераходы, адкрываецца велічная панарама пцічанскіх паплавоў, навакольных палёў, перадмесцяў...

Усё XVIII ст. Глуск належаў Радзівілам, трапляючы то ў Менскае ваяводства, то ў Навагрдскае. Няпэўнасць пры межах працягвалася і ў XX ст., калі Глускі раён трапляў то ў Бабруйскую, то ў Палескую, то ў Мінскую вобласці. Мо таму тут не так усё пераламалі, як у іншых гарадах. У Глуску засталася старадаўняя планіроўка, тузін старых камянічак, багата драўлянай местачковай забудовы, дзе кожны дом — сам сабе пан, выглядае пасвойму. То бок самавіты дух, старасвецкую атмасферу Глуск захаваў да нашых дзён.

У кафетэрыях ад самага рання можна выпіць добрай духмянай кавы, у рэстарацыі — няблага падсілкавацца, у крамах — набыць любыя прадукты. Такая-сякая гасцініца, вялікі рынак, дзе ўсё толькі самае-самае свежае. На ходніках — усюдыісны бетонны брук, у вокнах — шклопакеты. Як і ў Мінску. Толькі ў Глуску трава гусцейшая і паветра чысцейшае...


**Кахля, знойдзеная падчас раскопак глускага замку.**



**Завалочыцы**

вядомыя з 1626 як сяло ў складзе маёнтку Глуск Дубровіцкі. Тут быў і ўласны касцёл, філіял Глускага бернардынскага касцёлу. У XVIII ст. Завалочыцы былі цэнтрам вялікага маёнтку, што належаў панам Быкоўскім. За царом маёнтак набылі Жылінскія, якія разбудавалі тут вінакурны завод. Апошні завалачанскі пан, Язэп Жылінскі, быў вядомым геадэзістам. У 1873 быў прызначаны загадчыкам экспедыцыі па асушэнні пінскіх балотаў. У ягоным маёнтку аканомам рабіў Гедымін Булгак, муж роднай сястры Ф.Дзяржынскага Альдоны. Зрэшты, гэтая акалічнасць ніяк не абараніла Завалочыцы ад бальшавіцкіх рэпрэсіяў. У 1922 у маёнтку Завалочыцы створаны першы на Глушчыне саўгас. Слава якасных тутэйшых прадуктаў ад панскага часу была вялікаю. Да 1950-х увесь ураджай гароднiны і садавіны, тутэйшы мёд адпраўляліся проста ў Мінск.


**Лёхі Глускага замку.**



# Басовішча-2009

**17—18 ліпеня ў Гарадку (Польшча)** — 20-ы фестываль музыкі маладой Беларусі «Басовішча-2009». Бяруць удзел: **«Мроя»**, **ULIS**, **«Палац»**, **«Бонда»**, **N.R.M.**, **«Крама»**, **IQ48**, **«Дзецідзяцей»**... Весці фэст будзе **Віктар Шалкевіч**.

## Яшчэ можна паспець!

## КАНЦЭРТЫ




**«Грунвальдскі фэст» у «Рэактары»**

Штогадовы «Грунвальдскі фэст», прысвечаны бітве 1410 году пад Грунвальдам, пройдзе **15 ліпеня ў клубе «Рэактар» (В.Харужай, 29)**. У фэсце бяруць удзел гурты **Стары Ольса**, **Litvintroll**, **Рокаш**, **Testamentum Terrae**, **Яварына**, **Кейлі Кёл**, **Cornu Copia**, **Расалія** і іншыя. **Пачатак а 18-й.**

**Real Jazz Band**

**22 ліпеня а 19-й у «Графіці» (зав.Калініна, 16)** — Real Jazz Band.

**Madera Hard Blues**

**23 ліпеня а 19-й у «Графіці»** — гурт Madera Hard Blues.

**Андрэй Мельнікаў на Гомельшчыне**

Канцэрт-сустрэча з бардам Андрэем Мельнікавым пройдзе **ў намётавым мястэчку ля вёскі Раманавічы Гомельскага раёну 27 ліпеня**. **Пачатак у 21.00.** Ладзіцца канцэрт у межах кампаніі «Будзьма беларусамі!»

## ВЫСТАВЫ

**Выратаваныя культурныя каштоўнасці**

**У гістарычным музеі да 27 верасня** працуе выстава са зборам Смаленскага дзяржаўнага музея-запаведніка «Выратаваныя культурныя каштоўнасці». На выставе прадстаўлены 61 твор заходнееўрапейскага і расійскага жывапісу, мастацкія вырабы з металу, парцаляны і керамікі XVII—XX стагоддзяў.

**Вобраз іранскай жанчыны**

**У мастацкім музеі да 27 ліпеня** працуе выстава «Вобраз іранскай жанчыны», **а да 31 ліпеня** — «Традыцыйнае мастацтва Карэі».

**Мятлушкі**

**У галерэі Мінскага абласнога цэнтра народнай творчасці (Гікалы 4) да 31 жніўня** працуе выстава мятлушак «Жывыя кветкі».

**Узяць пад казырок**

**У музеі гісторыі тэатральнай і музычнай культуры (зав.Музычны, 5) да 28 жніўня** працуе выстава «Узяць пад казырок». У экспазіцыі — фуражкі, берэты, пілоткі, бесказыркі, бейсболкі і капелюшы... Найбольшую цікавасць выклікаюць галаўныя ўборы з чорнымі пеўневымі пёрамі італьянскіх берсальераў, а таксама футравыя шапкі англійскіх каралеўскіх гвардзейцаў, амуніцыя індыйскага паліцэйскага і парадная фуражка ваеннаслужачага французскага замежнага легіёну. Асаблівае месца на выставе адведзенае гісторыі формы беларускай міліцыі.

**Філасофія каменя**

**У галерэі «АртБлік» (Някрасава, 11) да 31 ліпеня** працуе выстава твораў майстра-ювеліра Вольгі Гараевай «Філасофія каменя».

**Рабізна і хвалі**

**У Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва (пр.Незалежнасці, 47) да 1 жніўня** працуе выстава «Рабізна і хвалі» Джорджа Сміта. Хваля ідзе следам за хваляй, але не як яе копія, а як варыяцыя, і пакідае іншыя ўзоры. І хвалі малююць сваю карціну наноў...

## ІМПРЭЗЫ

**Дабрачынная акцыя ў «Дрымлэндзе»**

**19 чэрвеня а 13-й у мінскім парку забаваў «Дрымлэнд» (Арлоўская, 80)** пройдзе дабрачынная акцыя «Каб было добра». Мэта акцыі — прыцягненне ўвагі да праблемы бяздомных жывёл у Беларусі. Чакаюцца конкурсы, эстрадныя і цыркавыя выступленні, віктарыны. Будзе магчымасць выбраць сабе сабаку ці ката з ліку беспрытульных. Ёсць зніжкі на ўваход для дзяцей, інвалідаў і пенсіянераў. Даведкі па тэл.: (017) 250-61-27.

**Малітоўная сустрэча моладзі ў Івянцы**

**24—26 ліпеня ў Івянцы** адбудзецца малітоўная сустрэча моладзі з удзелам Мітрапаліта Тадэвуша Кандрусевіча. Сёлета яе ўдзельнікі будуць разважаць на тэму таемстваў хросту і канфірмацыі. Адбудзецца таксама перэгрынацыя абраза Езуса Міласэрнага і рэліквій блаславёнага Міхала Сапоцькі. Будуць граць хрысціянскія музычныя калектывы з Польшчы **«Arka Noego»** і **«2 Tm 2, 3» («Tymoteusz»)**.

## ТЭАТРЫ

**16 ліпеня**

**Тэатр юнага гледача** — «Каралеўства крывых люстэркаў»

**Тэатр беларускай драматургіі** — «Хто пакахае мадам?»

**Музычны тэатр** — «Дон Жуан у Севільі»

**17 ліпеня**

**Музычны тэатр** — «Юнона і Авось»

**18 ліпеня**

**Музычны тэатр** — «Юнона і Авось»

**19 ліпеня**

**Музычны тэатр** — Гала-канцэрт, прысвечаны закрыццю тэатральнага сезону

**20 ліпеня**

**Купалаўскі тэатр** — «Таполевая завея»

**21 ліпеня**

**Купалаўскі тэатр** — «Каханне ў стылі барока»

**22 ліпеня**

**Купалаўскі тэатр** — «Сымон-музыка»

## КІНО НА ВЫХОДНЫЯ

### Зацягні мяне ў пекла

**Drag Me to Hell**

ЗША, 2009, каляровы, 99 хв.

**Рэжысёр:** Сэм Рэймі

**Ролі выконваюць:** Элісан Ломан, Джастын Лонг, Лорна Рэвэр, Дыліп Рао, Дэйвід Пэймэр

**Жанр:** фільм жахаў

**Адзнака:** 9 (з 10)

Сціплая банкаўская супрацоўніца (Элісан Ломан), зацікаўленая ў хуткай кар'еры, не пашкадавала старую, якую выстаўлялі з уласнага дому. Старая ведзьма пракляла гераіню — і цяпер на працягу трох дзён цёмныя сілы зацягнуць няшчасную ў пекла...

Карціна, што з'явілася на мінскіх экранах, — падарунак для аматараў хорару й вяртанне ў залатыя васьмідзесятыя, калі жахі былі наіўнымі і нахабнымі, а спалоханы віскат суседнічаў з рогатам.

Цэнтральнай фігурай гэтых васьмідзесятых быў Сэм Рэймі — кінахуліган са «Злоснымі мерцвякамі». У ягонай трылогіі героі дубасілі нячысцікаў кулакамі, стралялі з вінтоўкі і гатовыя былі адрэзаць уласныя рукі, калі яны іх уводзілі ў спакусу. Галівудскія студыі запрашалі Рэймі ажыўляць коміксы пра чалавека-павука. Рэжысёр спраўна рабіў супермэнскія бомба-фільмы. І хаця час ад часу ён здымаўся ў эпізодах у сяброў-хорармэйкераў, выглядала, што ён цалкам упісаўся ў галівудскі істэблішмэнт.

Сёлета Рэймі вярнуўся. У нізкабюджэтнай, ад душы зробленай стужцы ёсць усё, што праславіла рэжысёра. Ёсць саспэнс, цені, страхатлівыя пысы, якія нечакана з'яўляюцца (віскі ў залі пераходзяць у рогат). Ёсць у празмернасці тое, што Стывен Кінг з падлеткавай радасцю назваў «фу-эфектам»: старэчае вока залятае ў віскслівы дзявочы рот (фірмовы трук Сэма Рэймі), кроў залівае пінжак, зялёныя ваніты перадаюцца гвалтоўным пацалункам. Ёсць драпежныя насоўкі, кусачыя белыя казлы і раскапаныя магілы. Ёсць шалёны драйв — і трэшава-бадзёры рэжысёрскі гумар.

Карціна — ідэальная жахалка для людзей з моцнымі нервамі.

Хтосьці з гледачоў папалохаўся ды парагатаў з карцінаў пекла, а хтосьці і задумаўся пра змрочнае і сур'ёзнае пасланне, якое пакінуў ім весялун-рэжысёр.

Па-першае, гэта маралітэ пра свабоду волі і выбар дабра ці зла. Галоўная гераіня зрабіла цалкам свабодны выбар — кепскім учынкам. Так, бабулька, якой адмовіла гераіня, — гнюсная, як Баба-Яга, — слінявая, з чорнымі пазногцямі. Але, як казаў Гогаль, «палюбі нас чорненькімі». Гераіня не захацела — і атрымала ў падарунак пакуты сумлення і чорныя сцені. (А колькі ў кожнага такіх бабулек!)

Адзін дробны грэх пацягнуў за сабой іншыя — акультысты, сеансы медыюмаў, зарэзанае кацяня і развагі, каму б падсунуць страшны праклён.

Рэймі ненавязліва падае, што адзіны, каго баяцца нячысцікі, — гэта Бог. Але гэтага ва ўпор не бачаць героі. Псіхалогія, рэклама, здаровы сэнс пяюць ва ўнісон з акультыстамі: вы не вінаватыя, нічога не адбылося, падумаеш, што за дробязь.

Але самая непрыемная навіна для сучаснага чалавека: супермэнаў (і супергёрлаў), якія гераічна б'юцца са злом — але не здольныя даравацъ, — чакаюць палкія абдымкі пекла.

**Андрэй Расінскі**

# Алег Азароўскі: «Белазарам» можна карыстацца нават з мабільніка

**Праграміст Алег Азароўскі — з ліку людзей, якія застаюцца «за кадрам». Стварыўшы самастойна беларуска-расійска-беларускі кампутарны перакладнік «Белазар», над якім сядзеў бы крукам цэлы даследчы інстытут, ён не атрымаў вялікай вядомасці. З'яўленне сёлета новайверсіі «Белазару» — добрая нагода для гутаркі.**



**«Наша Ніва»: Алег, вашая праграма дапамагае ўзбагаціць слоўнікавы запас. Ці атрымлівалі Вы самі карысць ад распрацоўкі ў часе свайго навучання?**

**Алег Азароўскі:** Я пачаў распрацоўку «Белазару» ўжо пасля заканчэння навучання на факультэце прыкладной матэматыкі БДУ. А вось беларускую і расійскую мовы я вывучаў толькі ў школе. Таму даводзілося асвяжыць веды — праштудываць дапаможнікі па лінгвістыцы.

**«НН»: Вялікую частку слоўнікавых баз дапоўнілі Вы самі. Можаце пахваліцца, што ведаеце ўсе занесеныя словы?**

**АА:** Пазалетась я, мабыць, мог так сказаць. Цяпер ужо не. За апошнія два гады дададзена шмат тэрміналогіі з самых разнастайных галінаў ведаў: фізіка, медыцына... Таксама апрацавана некалькі перакладных слоўнікаў, што былі алічбаваныя аматарамі. Там сустракаюцца розныя састарэлыя ды абласныя словы, усе іх ведаць проста немагчыма.

**«НН»: А асабіста Вы ў жыцці гаворыце на якой мове?**

**АА:** У залежнасці ад атачэння. На працы і ў краме — звычайна па-расійску, дома — і так, і так, з беларускамоўнымі знаёмымі — безумоўна, па-беларуску. Я лічу, што ведаю абедзве мовы дастаткова добра, каб не мець праблемаў з хуткім пераходам з адной на другую.

**«НН»: Як да Вашага праекту паставіліся родныя і сябры? Усё ж праграма вымагае шмат часу, але не прыносіць грошай.**

**АА:** Мама ў мяне была настаўніцай беларускай мовы. Часам ёй даводзіцца адказваць на розныя мае хітрыя лінгвістычныя пытанні. Яна бачыла артыкулы ў прэсе пра мой перакладнік і, я ведаю, ганарыцца. Цяжэй за ўсё даводзіцца маёй каханай, бо на яе прыпадае большасць хатніх клопатаў. Я ёй вельмі ўдзячны за разуменне!

**«НН»: Ці прапаноўвалі Вам дапамогу ў часе стварэння праграмы Таварыства беларускай мовы, Таварыства беларускай школы, Беларускі Народны Фронт, якія звычайна прапагандуюць мову і вітаюць яе шырокі ўжытак?**

**АА:** Я маю кантакты з некаторымі сябрамі ТБМ. Яны дапамагалі ў працы як валанцёры, распаўсюджвалі «Белазар» на кампакт-дысках у Мінску. Аднак цяпер праблема распаўсюду не вельмі актуальная: інтэрнэт ёсць амаль у кожнай хаце, і спампаваць праграму — справа некалькіх хвілін. «Белазар» таксама распаўсюджваецца на некаторых беларускіх зборках софту на кампакт-дысках.

**«НН»: Колькі людзей запампавала сабе праграму?**

**АА:** Па маіх падліках за апошняе паўгоддзе «Белазар» пампуюць паўтары тысячы разоў на месяц. Апошнюю версію праграмы, якая выйшла ў пачатку траўня, загрузілі тры з паловай тысячы наведнікаў.

**«НН»: Няўжо ўсё магчымае ў «Белазары» ўжо зроблена?**

**АА:** Безумоўна, не! Спіс будучых дапрацовак для перакладніка займае восем старонак дробнага тэксту. Там ёсць, напрыклад, карэктны пераклад асабовых іменаў, удасканаленне дапасавання прыназоўнікаў да назоўных групаў, кантэкстная памяць і шмат іншага. Аднак я хачу звярнуць вашую ўвагу на некаторыя тэндэнцыі ў інфармацыйных тэхналогіях. Па-першае, платформы персанальных кампутараў і Windows у прыватнасці стрaчваюць сваё дамінoўнае становішча. Паступова распаўсюджваюцца іншыя аперацыйныя сістэмы, з'яўляюцца іншыя кампутарныя прылады, якія могуць выйсці ў Сеціва. Па-другое, усё часцей людзі замест традыцыйных кампутарных праграм пачынаюць карыстацца інтэрнэт-сэрвісамі для штодзённай працы: набору тэкстаў, табліц, чытання пошты...

**«НН»: Значыцца, і «Белазар» будзе выкарыстоўвацца перадусім у інтэрнэце?**

**АА:** Лінгвістычныя праграмы рухаюцца гэтым шляхам — усе вядомыя ў гэтай галіне кампаніі займелі свае анлайн-слоўнікі і сервісы перакладаў. Дзякуючы гэтаму наведнікі заўсёды карыстаюцца апошняй версіяй слоўніка, якіне трэба пампаваць сабе і ўсталёўваць на кампутары. У дадатак, слоўнікам можна карыстацца з любой прылады, што мае выхад у інтэрнэт, — хоць з кішэннага кампутара, хоць са звычайнага мабільніка. Што датычыць традыцыйных перакладнікаў і слоўнікаў у выглядзе кампутарных праграм, дык яны застануцца, але, напэўна, будуць ссоўвацца ў бок прафесійнага выкарыстання, для людзей, што займаюцца перакладамі штодня і зарабляюць гэтым на жыццё. Здаецца, такі шлях сёння з'яўляецца аптымальным.

**Ягор Марціновіч**

**Алег Азароўскі**

35 год, матэматык-сістэмны праграміст. Скончыў Факультэт прыкладной матэматыкі і інфарматыкі (ФПМІ) БДУ ў 1995. Жыве ў Лідзе (Гродзенская вобласць).

Упершыню «Белазар» быў выкладзены ў інтэрнэце ў канцы 2002. Тады ж з'явіўся заклік да ахвотнікаў: дапамагайце! Трэба было павялічваць базу — фактычна пераводзіць слоўнікі ў фармат праграмы. Атрымаўшы заданне, валанцёры мусілі яго выканаць і даслаць вынікі сваёй працы Алегу Азароўскаму. Памер слоўніка разрастаўся імкліва. Прычым уся праца выконвалася не за грошы, а за ідэю. Цалкам бясплатнай праграма засталася і да цяперашняга часу.

Перакладны слоўнік «Белазар» складае 110 тысяч беларускіх і 152 тысячы расійскіх слоўнікавых артыкулаў.

У назве праграмы захаваная частка прозвішча Алега Азароўскага: «БелАЗАР».

Перакладнік можна бясплатна спампаваць на сайце www.belazar.belinter.net

Выпусціўшы чарговую версію, Алег Азароўскі змясціў абвестку на галоўнай старонцы сайту: «Цяпер я планую прыпыніць на найбліжэйшы тэрмін распрацоўку перакладніка «Белазар».

## «БЕЛСАТ»: ТЭЛЕПРАГРАМА НА 20 ЛІПЕНЯ—26 ЛІПЕНЯ

# «Белсат» — гэта незалежны беларускі спадарожнікавы тэлеканал

### 20 ліпеня, панядзелак

**19.00** Аб'ектыў (агляд падзей дня)
**19.05** «Элі Макбіл», тэлесерыял: V сезон, 10 серыя
**19.50** Прэс-экспрэс (агляд медыяў)
**20.10** На колах (аўтамабільны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»)
**20.35** Госць «Белсату»: Славамір Адамовіч
**20.50** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Крыжакі» (спазнаваўчая праграма)
**21.00** Аб'ектыў (галоўны выпуск)
**21.20** «Дзікія пчолы», маст. фільм, рэж. Багдан Слама, 2001 г., Чэхія.
**23.00** Аб'ектыў

### 21 ліпеня, аўторак

**19.00** Аб'ектыў (агляд падзей дня)
**19.05** «Ранча», серыял: 46 серыя
**19.55** Побач з намі
**20.15** Акно ў Еўропу (інфармацыйная праграма)
**20.50** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Ці існаваў старажытнарускі народ?» (спазнаваўчая праграма)
**21.00** Аб'ектыў (галоўны выпуск)
**21.20** «Кансультацыя ў ружовым садзе», серыял: 16 серыя
**22.15** Еўропа сёння (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»)
**22.40** Аб'ектыў

### 22 ліпеня, серада

**19.00** Аб'ектыў (агляд падзей дня)
**19.05** «Ранча», серыял: 47 серыя
**19.55** Хто ёсць кім: «Драма Васіля Старавойтава», ч. 2
**20.20** Праект «Будучыня» (навукова-папулярны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»)
**20.50** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Ягайла» (спазнаваўчая праграма)
**21.00** Аб'ектыў (галоўны выпуск)
**21.20** «Кропачка і Антон», маст. фільм, рэж. Караліна Лінк, 1999 г., Нямеччына.
**23.05** Аб'ектыў

### 23 ліпеня, чацвер

**19.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня)
**19.05** «Ранча», серыял: 48 серыя
**20.00** YoLife! (моладзевая праграма)
**20.15** На колах (аўтамабільны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»)
**20.50** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Ці існаваў старажытнарускі народ?» (спазнаваўчая праграма)
**21.00** Аб'ектыў (галоўны выпуск)
**21.20** «Шляхам мары», рэпартаж, 2007 г., Беларусь
**21.50** Форум (ток-шоў): «Іншая Беларусь»
**22.40** Аб'ектыў

### 24 ліпеня, пятніца

**19.00** Аб'ектыў
**19.05** Дакументальная гадзіна: «Рускае шчасце», дак. фільм, рэж. Юрый Хашчавацкі, 1996 г., Беларусь
**20.00** Еўрапейскі Звяз без сакрэтаў, 5 серыя: «Энэргетычная бяспека»
**20.20** Побач з намі
**20.35** Госць «Белсату»: Стэфан Эрыксан — амбасадар Швецыі ў Рэспубліцы Беларусь
*З усіх кіраўнікоў амбасадаў у цяперашняй Беларусі шведскі пасол Стэфан Эрыксан не толькі адзін з наймаладзейшых, але і беларускамоўны. Таксама дзякуючы сп. Эрыксану беларуска-шведскія культурныя стасункі цяпер перажываюць самы сапраўдны рэнесанс.*
**20.50** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Ягайла» (спазнаваўчая праграма)
**21.00** Аб'ектыў (галоўны выпуск)
**21.20** «Павернуты», маст. фільм, рэж. Казімеж Куц, 1994 г., Польшча.
**22.40** Аб'ектыў

### 25 ліпеня, субота

**19.00** Аб'ектыў (агляд падзей дня)
**19.05** МакраФон: «Басовішча-2008»: канцэрт гурта «Neuro Dubel»
**19.50** Чалавек-эпоха: «Сталін. Смерць дыктатара», дак. фільм, рэж. Хельге Трамперт, Інга Вольфрам, 2003 г., Нямеччына
**20.50** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Крыжакі» (спазнаваўчая праграма)
**21.00** Аб'ектыў (галоўны выпуск)
**21.10** Еўропа сёння (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»)
**21.40** «Дэтэрмінатар», серыял: 3 серыя
**22.25** Жаўтуха (сатырычная праграма)
**22.50** Аб'ектыў

### 26 ліпеня, нядзеля

**19.00** Прэс-экспрэс (агляд медыяў)
**19.15** «Элі Макбіл», тэлесерыял: V сезон, 11 серыя
**20.05** МакраФон: «Minsk-Mixt—2008», ч. 5: канцэрт гурта «Ветах»
**20.20** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «Партызанская школа», дак. фільм, рэж. Юрый Каліна 2002 г., Польшча
**20.50** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Вітаўт» (спазнаваўчая праграма)
*Пару валадарання Вітаўта ўсе летапісцы прызнаюць росквітам нашай дзяржавы — Вялікага Княства Літоўскага. Менавіта тады яна стала самаю вялікаю ў Еўропе. Але дарога да ўлады была непростай...*
**21.00** Аб'ектыў (вынікі тыдня)
**21.20** Акно ў Еўропу (інфармацыйная праграма)
**21.45** Фільматэка майстроў: «Несвядомыя», маст. фільм, рэж. Хаакін Арыстрэль, 2004 г., Іспанія—Нямеччына—Партугалія—Італія.



# Гламурнае жніво

**Упэўнены, што крытыка кіраўніка дзяржавы на адрас гламуршчыкаў прымусіць апошніх падкарэктаваць свой неарыгінальны стыль жыцця. Фельетон Лёліка Ушкіна.**

*«...складаецца ўражанне, што яны (музыкі) гэта робяць па шаблоне, у пагоні за гламурнасцю страчваюць арыгінальнасць, не кранаюць сэрцаў людзей».*
**А.Лукашэнка падчас адкрыцця «Славянскага базару»**

ЛЕВЫМ ВОКАМ



...Стаяў працоўны поўдзень. Волаты бітвы за ўраджай-2009 праходзілі фэйс-кантроль у сталоўку, дзе мелася адбыцца крутая элітная тусоўка, прысвечаная прэзентацыі новага барабана для жаткі.

Свецкая ільвіца Аліна Молава пачувалася як рыба ў вадзе. Яна вяла з механізатарамі, аграномамі і шафёрамі салонныя размовы пра трансмісію, закупныя цэны на бульбу і спосабы прадзімання карбюратара.

— Ой, людзі, што ж гэта на свеце робіцца, — увесь час паўтарала Молава, кранаючы сэрцы прысутных.

І менавіта ў гэты час у памяшканні з'явілася ўласнай персонай Юся Ушчык.

Аліна адразу скруціла губкі. Яны з Юсяй— каралевы тусовак, прыёмаў, дажынак, кактэйляў, прэзентацый — ненавідзелі адна адну. Тым больш што інтарэс прысутных журналістаў глянцавых раёнак адразу перакінуўся на новую госцю. «Юся, чаму вы перайшлі з белых семак на чорныя?», «Юся, гэта праўда, што ў вас раман з трактарыстам СВК імя Зімоўскага?»

Ушчык адказвала на ўсе пытанні, як і належыць шыкоўнай жанчыне, інтрыгоўна і загадкава: «Купляйце беларускае!»

Гледзячы на трыюмф канкурэнткі, Молава хуценька прыкідвала. Найлепшай контратакай на выпады Ушчык было б цапануць крутога бойфрэнда. Аліна агледзела тусач: вось і ён! Сціплы хлопец з камбайнёрскім загарам, голенай галавой і фугасам моднага кактэйлю «Русалачка».

Аліна падплыла да ахвяры і закінула прынаду: «Банжур, глядзіш канал «Лад»?»

Хлопец задумаўся.

Між тым Ушчык адсачыла тактычны ход праціўніцы. Яна на хвілінку ўявіла заўтрашнія загалоўкі Sun, Cosmopolitan і Vogue: «Сенсацыя! У Молавай новы камбайнёр», «Молава адрываецца на жніве». Юся спрытна пайшла на таран.

— Прывітанне, салодкі, — прапяяла яна, набліжаючыся да таго ж хлапца. — Як ты лічыш, ці збярэм мы сёлета 9 млн тон?

Хлопец задумаўся.

Тут ужо Аліна не змаўчала: «Табе чаго трэба ад майго хахаля, гламуршчыца?!»

Такога наезду Ушчык не магла стрываць:

— Я гламуршчыца?!. Ты ж у салярый хадзіш! Калі ў гарадской лазні апошні раз была?

— А хто ж ты яшчэ! Прафукала падпіску на «Савецкую Беларусію»!

— А ты ў сельпо эпілятары з пахам грэйпфруту шукала!

— А ты, а ты....

У гэты момант прэзентацыя новага барабана для жаткі скончылася. Брыгадзір закрычаў. Людзі разбегліся па камбайнах і трактарах. Засталіся трое ў кутку сталоўкі. Іх заўважыў брыгадзір.

— Ляфімаў, што ты звязаўся з гэтымі гламуршчыцамі? Што скажа твая сяброўка, даярка Жанэт?

Хлопец задумаўся. Махнуў галавою і спрытна пабег даганяць свой камбайн.










## «Нецвярозыя» здымкі Мядзведзева на саміце G8

**У інтэрнэце актыўна абмяркоўваюцца фотаздымкі прэзідэнта РФ, зробленыя на саміце Вялікай васьмёркі ў Італіі.**

Меркаванні ўдзельнікаў дыскусіі падзяліліся на тых, хто лічыць, што Дзмітры Мядзьведзеў, апынуўшыся ў кампаніі еўрапейскіх лідэраў, банальна нажлукціўся. Абаронцы кіраўніка Расіі вінавацяць фатографаў, якія выкарысталі хуткасную здымку, якая дазваляе фіксаваць мікрасекундную міміку чалавека. Так, на відэароліках бачна, што прэзідэнт Мядзведзеў ходзіць досыць упэўнена і без старонняй дапамогі.

**Салідарнасць**

## «НН» СТО ГАДОЎ З ВАМІ

**Даўгінаў, Віленск. губ., Вілейск. пав.** Калісь у нас ніхто не меў ні замкоў, ні ключоў, бо зладзейства не было; але цяпер ужо пачалі і красці. Нядаўна ўкралі ў мясцовага старасты Савіцкага каня і 100 руб. грошай. Ураднік наш ехаў з 2 стражнікамі ў м.Крайск і спаткаў нейкіх трох невядомых людзей. Хацеў іх затрымаць, а тыя сталі страляць у паліцыю. Скончылася тым, што спаміж гэтых трох аднаго падстрэлілі, і ўсіх іх заарыштавалі.

**«Наша Ніва». №26. 1909**

## АНЕКДОТЫ

— Даруйце, сэр, але я не магу пусціць вас у казіно! Вы без гальштука!
— І што з гэтага?! Вунь той увогуле голы!
— Так, але ён выходзіць...

***

Стаіць адзінокі дайшнік, бачыць — да яго бабулька з каровай ідзе. Падыходзіць бліжэй, пачынае навязваць карову зусім побач са здзіўленым дайшнікам.
— Бабуля, вы чаго?! Тут жа не паша!
— Ну, не ведаю. Летась, унучак, ты тут такі худы стаяў...

***

Дачка вучыцца на кухара. Маці:
— А вам дазваляюць есці тое, што вы згатавалі?
Дачка (скрозь слёзы):
— Нас прымушаюць!

## КАДРЫ




**Незвычайны білет атрымала мінчанка пры перасадцы ў аэрапорце Франкфурта-на-Майне, калі ляцела з Лос-Анджэлеса ў Беларусь. Як бачна на здымку, у Франкфурце беларуская сталіца дагэтуль лічыцца часткай СССР. «Еўрарадыё»**

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### ВІТАННІ

**Хачу падзякаваць спадарыням Надзеі Запруднік і Лідзіі Літаровіч**, якія адгукнуліся на мой заклік і дапамаглі мне. Павал Давыдзенка, Парычы, Светлагорскі раён

### КНІГІ

**Кнігаабмен.** Дашлю новы спіс прапановаў. alesknihi@mail.ru

### ДЭКАРАТЫЎНЫЯ ТРУСЯНЯТЫ

**Прадаем** маленькіх дэкаратыўных трусянят. Т.: (029) 577–78–07, (029) 677–29–34

### ПРАЦА

**Якасна выканаю пісьмовыя працы** па беларускай гісторыі, літаратуры, мове. Звяртацца загадзя. Т.: (029) 101–03–24, Юрась

Якасны набор, рэдагаванне тэкстаў на беларускай мове. Звяртацца загадзя. Т.: (029) 101–03–24, Юрась

### СЯБРОЎСКІЯ ПАДАРОЖЖЫ

**Краязнаўчыя вандроўкі па Ганцаўшчыне** (Брэсцкая вобласць), арганізаваныя моладзевым грамадскім аб'яднаннем «Гісторыка», пройдуць 19 ліпеня. Маршрут: Агарэвічы—Шашкі—Вялікія Круговічы—Будча—Людвікова—Чудзін—Ганцавічы (краязнаўчы музей). Для зацікаўленых: (029) 761–07–94 (Кірыла).

**Прыватныя абвесткі ў «НН»** (не больш за 15 словаў) можна падаць бясплатна. Дасылайце поштай (а/с 537, 220050, Мінск) ці праз e-mail (nn@nn.by) або размяшчайце на форуме сайту www.nn.by. Дык скарыстайцеся!

**Наша Ніва**
незалежная газета

заснаваная ў 1906, аднoўленая ў 1991
**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
шэф-рэдактар — Андрэй Дынько
галоўны рэдактар — Андрэй Скурко
мастацкі рэдактар — Сяргей Харэўскі
заснавальнік — Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»
выдавец — Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Мінск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**

© НАША НІВА. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.
12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП №02330/0494179 ад 03.04.2009. Пр. Незалежнасці, 79, 220013, Мінск. Рэдакцыя не нясе адказнасці за змест рэкламных абвестак. Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №248 ад 22 чэрвеня 2009 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Мінск, пр. Ракасоўскага, 102–71. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Мінск, код 764.

Наклад 6100. Газета выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 23.00 14.07.2009.
Замова № 3780.
Рэдакцыйны адрас: Ракасоўскага, 102–71.
Цана дамоўная.
ISSN 1819-1614

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12